№№11–12
(3348–3349)

25—27 студзеня 2011 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

Да ўвагі!
Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

www.nv-online.info

Народная Воля

*На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...*
Якуб КОЛАС

Рэзалюцыя Еўрапейскага парламента адносна сітуацыі ў Беларусі

Еўрапейскі парламент,

— маючы на ўвазе папярэднюю рэзалюцыю Еўрапарламента адносна сітуацыі ў Беларусі, у прыватнасці, рэзалюцыю ад 17 снежня 2009 г.,

— маючы на ўвазе Рашэнне Савета 2010/639/CFSP ад 25 кастрычніка 2010 г. адносна абмежаванняў у дачыненні да пэўных афіцыйных асобаў Беларусі працягнуць іх да 31 кастрычніка 2011 г.,

— маючы на ўвазе Рашэнне Савета замежных спраў ад 25 кастрычніка 2010 г.,

— маючы на ўвазе заявы Офіса дэмакратычных інстытуцый і правоў чалавека АБСЕ і Парламенцкай асамблеі АБСЕ "Аб папярэдніх высновах адносна прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі" ад 20 снежня 2010 г.,

— маючы на ўвазе Правіла 110 Рэгламенту,

A. У сувязі з тым, што Пражская дэкларацыя саміту Усходняга партнёрства зноў пацвердзіла, у тым ліку і адносна Беларусі, адданасць прынцыпам міжнароднага закона і асноўным каштоўнасцям, у іх ліку дэмакратыі, вяршэнства закона і павагі да правоў чалавека і асноўных свабод,

B. У сувязі з тым, што Савет 25 кастрычніка 2010 г. "заклікаў ўлады Беларусі забяспечыць правядзенне прэзідэнцкіх выбараў у адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі і нормамі дэмакратычных выбараў АБСЕ і ААН,

C. У сувязі з тым, што Беларусь прыняла на сябе абавязацельствы ўлічыць рэкамендацыі АБСЕ і Офіса дэмакратычных інстытуцый і правоў чалавека адносна ўдасканалвання Выбарчага кодэкса Беларусі з мэтай прывесці яго ў адпаведнасць з міжнароднымі стандартамі дэмакратычных выбараў і кансультавацца адносна прапанаваных змен з АБСЕ; у сувязі з тым, што парламент Беларусі прыняў рэформу Выбарчага кодэкса без папярэдняй кансультацыі з АБСЕ,

D. У сувязі з тым, што Савет "зноў пацвердзіў сваю гатоўнасць пашыраць дачыненні з Беларуссю ў залежнасці ад развіцця Беларусі ў кірунку да дэмакратыі, павагі да правоў чалавека і вяршэнства закона, а таксама гатоўнасць дапамагаць Беларусі ў дасягненні гэтых мэтаў",

E. У сувязі з тым, што Савет, пасля ацэнкі прагрэсу ў Беларусі, вырашыў працягнуць абмежавальныя захады супраць пэўных афіцыйных асоб Беларусі, але прыпыніць ўжыванне візавых санкцый на паездкі ў ЕС да 31 кастрычніка 2011 г.,

F. У сувязі з тым, што ў адпаведнасці з заявамі ПА АБСЕ і Офіса дэмакратыі і правоў чалавека АБСЕ "Аб папярэдніх высновах адносна прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі" пэўны прагрэс можна адзначыць падчас выбарчага працэсу, але ён азмрочаны сур'ёзнымі парушэннямі падчас галасавання і гвалтам у дзень выбараў 19 снежня,

G. У сувязі з тым, што больш за 700 чалавек былі зняволены за іх удзел у дэманстрацыі 19 снежня ў Мінску, большасць з іх была вызвалена пасля адбывання кароткіх тэрмінаў зняволення паводле адміністрацыйных прысудаў, тым часам як 24 апазіцыйныя журналісты і актывісты, у тым ліку 6 кандыдатаў у прэзідэнты, былі абвінавачаны "ў арганізацыі масавых беспарадкаў" і ім пагражае да 15 гадоў зняволення, а яшчэ 14 чалавек могуць быць асуджаны такім жа чынам неўзабаве,

H. У сувязі з тым, што разгон міліцыяй дэманстрацыі 19 снежня 2010 г. і далейшыя захады правахоўных органаў супраць дэмакратычнай апазіцыі, свабоды медыяў і грамадзянскай супольнасці былі асуджаны прэзідэнтам Еўрапарламента, высокімі прадстаўнікамі ЕС і Генеральным сакратаром ААН,

I. У сувязі з тым, што адвакаты, якія прадстаўляюць дэмакратычных актывістаў, апазіцыянераў і іх родных, не дапускаюцца да зняволеных,

1. Прызнае, што адпаведна з папярэднімі высновамі ПА АБСЕ і Офіса дэмакратычных інстытуцый і правоў чалавека аб тым, што прэзідэнцкія выбары 19 снежня 2010 г. не адпавядалі міжнародным стандартам свабодных, справядлівых і празрыстых выбараў; прызнае, што ў гэтым галасаванні была страчана чарговая магчымасць для дэмакратызацыі Беларусі, і заклікае, у сувязі са шматлікімі сур'ёзнымі парушэннямі, адзначанымі АБСЕ, да новых выбараў, якія б былі праведзены адпаведна з свабоднымі і дэмакратычнымі нормамі і стандартамі АБСЕ;

2. Асуджае ўжыванне супраць пратэстуючых грубай сілы міліцыяй і КДБ у дзень выбараў, асабліва жорсткі напад на У.Някляева, парушэнне правоў на свабоду сходаў і выказвання, а таксама правоў чалавека і выказвае заклапочанасць спробамі ўлад Беларусі ўзяць пад апеку Даніила Саннікава, 3-гадовага сына кандыдата ў прэзідэнты Андрэя Саннікава і журналісткі Ірыны Халіп, якія застаюцца зняволенымі з 19 снежня; асаблівую занепакоенасць выказвае станам здароўя Мікалая Статкевіча, які ўжо месяц трымае галадоўку;

(Заканчэнне на 2-й стар.)

ДОСЛОВНО

Борис БЕРЕЗОВСКИЙ:

"Я считаю, что никакой попытки захвата Дома правительства не было. Еще раз говорю — это была спецоперация российских спецслужб. Главное, что надо было сделать, — это выставить охрану для кандидатов в президенты, которые пришли на этот митинг. Спецслужбы Лукашенко должны были их охранять, а не бить по голове. Это и была бы победа Лукашенко... У меня такое впечатление, что Лукашенко сам не ожидал, что мир придаст такое значение тому, что произошло 19 декабря. Не сомневаюсь, что его подставило ближайшее окружение. Я даже более-менее представляю, кто это делал — его собственные спецслужбы, которые давали ему ложную информацию о событиях, которые происходили на площади 19 декабря. И эти сотрудники — безусловно, сотрудники одновременно российских спецслужб. И в первую очередь речь идет о председателе КГБ Беларуси".

(Из интервью украинской газете "Сегодня".)

Александр ЛУКАШЕНКО:

"Многие сегодня пытаются обвинить КГБ, МВД и весь силовой блок страны в том, что они якобы дезинформировали и обманули президента. Я попрошу в этой связи всем успокоиться и понять одну вещь: первым, кто защищает суверенитет и независимость страны и ту систему, которая функционирует, является президент. Никаких действий правоохранительные органы не предпринимали, не предпринимают и не будут предпринимать по наведению порядка в стране без санкции президента".

(Из выступления на совещании по внутриполитическим вопросам 20 января.)

Вярхоўны Суд адмовіўся разглядаць скаргу БХК на вынікі прэзідэнцкіх выбараў

Вярхоўны Суд Беларусі адмовіўся разглядаць скаргу праваабаронча арганізацыі "Беларускі Хельсінкскі камітэт". Скарга тычылася непрызнання вынікаў прэзідэнцкіх выбараў.

"Вярхоўны Суд адмовіўся заводзіць справу па скарзе аб непрызнанні прэзідэнцкіх выбараў", — паведаміла "Інтэрфаксу" прэс-сакратар Вярхоўнага Суда Настасся Цімановіч.

"Дадзенае вызначэнне суда абскарджанню і агратэставанню ў касацыйным парадку не падлягае", — дадала яна.

Скарга ў Вярхоўны Суд была накіравана 10 студзеня.

"Па выніках назірання за выбарамі БХК прыйшоў да высновы, што ў час рыхтавання і правядзення выбараў прэзідэнта Беларусі дапускаліся грубыя адступленні ад дэмакратычных прынцыпаў і стандартаў... Падлік галасоў... суправаджаўся паўсюднымі парушэннямі вызначанага законам парадку, у сувязі з чым выбары павінны быць прызнаныя несапраўднымі, паколькі выяўленыя парушэнні паўплывалі на вынікі выбараў. Усё гэта прывяло да скажэння вынікаў выбараў, абвешчаных ЦВК", — гаворыцца ў скарзе.

Нагадаем, што Вярхоўны Суд не задаволіў зварот былога кандыдата ў прэзідэнты Рыгора Кастусёва, які таксама прасіў перагледзець рашэнне Цэнтральнай выбарчай камісіі аб прызнанні прэзідэнцкіх выбараў.

КАМЕРТОН

Сергея Ваганова

Венок от Некляева

Самое страшное в жизни — это одиночество. Страшней только одиночество в смерти.

В минувшую среду хоронили журналиста Виталия Тараса. Десятки людей разделили с ним тяжесть утраты жизни и почти невесомую, безгрешную легкость, с какой он покинул пределы земного мира. Сотни отозвались на его уход болью в душе. Болью, с какой надломилась самая, может, цветущая ветвь на древе большой известной семьи.

Люди толпились на узком пространстве вокруг потревоженной могилы Валентина Тараса, отца, рядом с которой желтела свежей насыпью могила для сына и стоял гроб.

Два года отделили их от этого свидания, два года жестокой болезни. Но ни следа от нее, ни крика, ни муки — так светел и покоен был его лик.

Он все-таки победил ее, эту болезнь, подумал я. Тело изнемогло, а дух победил.

Они, в конце концов, всегда побеждают — одухотворенные люди…

…Через день я стоял, минут сорок, в невообразимой даже для сегодняшнего Минска автомобильной пробке — не меньше километра до моста над проспектом Победителей. Под этим мостом то ли уже проехал, то ли еще должен был проехать на победное торжество кортеж с Александром Лукашенко. Водитель грузовика в соседнем ряду почти влез на кабину, пытаясь что-то высмотреть впереди, потом грубо выругался:

— Какого х… держать столько людей!

Он никому не мешал, этот мост. Но был пуст — милиция с обеих сторон перекрыла его, чтобы… Оно и правда, на мостах и с мостов чего только не случается…

Вечером, обозревая кадры этого проезда по совершенно опустевшему, лишенному малейших признаков жизни городу, ведущий новостей, едва не захлебнувшись собственным приподнятым самочувствием, обозначил символическое совпадение события с названием проспекта — Победителей.

Помнится, имя Машерова забирали у проспекта по "просьбе группы ветеранов".

Те ветераны, которые не просили об этом, были оскорблены.

И вот он, венец замысла: проспект *Победителя*.

Да, *победитель* **один.**

И одинок.

Да, похоже он был совершенно одинок, когда вышел из бронированного, напоминающего катафалк, черного "мерседеса", держа за руку своего маленького сына. В тот момент подумалось, что он сам держится за нее…

Он был совершенно одинок даже тогда, когда, убыстряя шаг, шел по наклонному проходу зала к пьедесталу, подбодрив себя каким-то полуспортивным жестом…

Он был совершенно одинок даже тогда, когда, отрываясь от текста и обводя тяжелым взглядом притихшую аудиторию, пытался уловить от нее хоть какой-то правдивый, без фальши, отклик, нащупать хоть какую-то душевную связь. Хотя чуял, всегда чуял, что ни души, ни правды в глазах верноподданных никогда не было и нет…

…Облака посветлели, через них глянуло солнце, и пошел, не спеша опускаться на землю, мягкий снег. Люди выстроились друг за другом, чтобы каждый мог попрощаться с Виталием так же светло, несуетно, не спеша… Кто-то попросил меня подержать венок, пока будет прощаться. Я расправил ленту: "…ад Уладзіміра Някляева"…

Человек, при власти которого безнаказанно избивают Поэта, а потом бросают в тюрьму, наверняка знает, что самое страшное в жизни — это одиночество. Страшней только одиночество в смерти.

Но этот человек не знает, даже, видимо, не догадывается, что одухотворенные люди не бывают одинокими даже наедине с собой. Ни в жизни, ни в смерти.

Вот и решайте теперь, кто Победитель: тот, кто с процентами, или тот, кто с людьми.

Сёння і заўтра яшчэ можна падпісацца праз аддзяленні «Белпошты» на «Народную Волю», з тым каб атрымліваць газету з 1 лютага

ВИЗИТ

«Власти США пока не намерены рассекречивать информацию о личных счетах белорусских чиновников...»

Заместитель помощника Госсекретаря США Томас Мелиа завершил свой визит в Беларусь.

Перед возвращением на родину он ответил на вопросы журналистов.

Визит в Минск **Томаса Мелиа** проходил по поручению Госсекретаря США **Хиллари Клинтон**. Чиновник должен был передать в Беларусь несколько посланий. Первое было адресовано правительству страны и содержало требование отпустить всех политзаключенных, которые попали в СИЗО после выборов 19 декабря, и снять обвинения со всех фигурантов дела о массовых беспорядках.

Кроме того, заместитель помощника Госсекретаря встречался с родственниками арестованных политиков и независимыми экспертами. С самими заключенными СИЗО КГБ американский политик встретиться даже не надеялся.

"Мы знали, что даже адвокаты, родственники и врачи не имеют нормального доступа к заключенным, — рассказал "Народной Воле" Томас Мелиа. — *Именно поэтому и приехали в Беларусь. Но надежды на то, что для нас сделают исключение и мы встретимся с арестантами, у нас не было".*

По инициативе американской стороны в Министерстве иностранных дел состоялась встреча на уровне начальников управлений Америки и гуманитарного сотрудничества. У министра иностранных дел и его заместителя времени на разговор с американскими дипломатами не нашлось. Именно на этой встрече было заявлено, что санкции против правительства Беларуси будут введены, если ситуация в стране не изменится.

Отвечая на вопрос "Народной Воли" о возможной публикации данных расследования, которое должно было выяснить все о личных финансовых счетах высокопоставленных чиновников Беларуси, Томас Мелиа выразился максимально пространно: *"Сейчас мы не можем сказать ничего нового по этому делу. Такие меры могут быть приняты в дальнейшем".*

Кроме того, Мелиа несколько раз обратил внимание на то, что белорусские власти постоянно меняют версии событий, случившихся 19 декабря. Это касается не только сценария событий "площчы", но и версии международных заговоров против властей Беларуси.

"До выборов казалось, что заговор готовит Россия, после оказалось, что виновники — Польша и Германия. Кто знает, чего ждать на следующей неделе?" — позволил себе иронию высокопоставленный американский чиновник.

Мария МАЛЕВИЧ.

БЕЗ ГРЫФА «САКРЭТНА»

Сфальсіфікавалі?!

Хто і як знайшоў адказ на гэтае пытанне

Дык усё ж колькі галасоў набраў А.Лукашэнка?

Пытанне, дакладны адказ на якое пралівае святло **на самае галоўнае** — вынікі выбараў сфальсіфікаваны ці не?

Але пойдзем па парадку.

Небезвядомая Ярмошына аб'явіла: А.Лукашэнка набраў 79,65 працэнта ад агульнай колькасці выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні.

Апазіцыя, абапіраючыся на вынікі, атрыманыя на тых участках, дзе падлік галасоў быў празрыстым, паведаміла: А.Лукашэнка набраў менш за 50 працэнтаў галасоў.

І тут з'явілася трэцяя інфармацыйная крыніца. Згодна з апытаннямі, праведзенымі Незалежным інстытутам сацыяльных і эканамічных даследаванняў (зарэгістраваны ў Вільнюсе), на выбарах 19 снежня за А.Лукашэнку прагаласавала 58 працэнтаў беларусаў, прыйшоўшых на выбарчыя участкі.

Такім чынам:

79,65 працэнтаў...

Менш за 50 працэнтаў...

58 працэнтаў...

Тры абсалютна розныя лічбы!

Улады, вядома ж, і слухаць не хочуць пра сцвярджэнні апазіцыі. Але ж вось вам лічба сацыёлагаў на чале з прафесарам А.Манаевым — 58 працэнтаў. І, што цікава, за яе, як за выратавальную саломінку, ухапіліся лукашэнкаўскія памагатыя. У "самай чэснай" газеце чытаем: *"НИСЭПИ пришел к выводу, что А.Лукашенко вновь с колоссальным отрывом от соперников выиграл президентские выборы (что предсказывали все опросы социологов), и это не подлежит никакому сомнению. Комментируя итоги опроса, профессор Манаев заявляет: "Понимая политическую и моральную ответственность момента, мы многократно перепроверили эти цифры как дублирующими вопросами, так и многосторонним кросс-анализом".* І далей: *"...исследования НИСЭПИ имеют эффект разорвавшейся бомбы".*

Так, бомба выбухнула! І выбухнула яна з асаблівай сілай пасля таго, як афіцыйны лукашэнкаўскі рупар публічна прызнаў вынікі нацыянальнага апытання, праведзенага НІСЭПД. Ярмошына, паўтараем, агучыла: за Лукашэнку прагаласавалі 79,65 працэнта выбаршчыкаў, атрымаўшых бюлетэні. У той жа час прафесар Манаеў назваў лічбу значна ніжэйшую — 58 працэнтаў. Пра што гаворыць такое вялікае разыходжанне? Адказ на гэтае пытанне, мяркуем, ведае кожны чытач. І тут абсалютна незразумелым выглядае рэзюме "самай чэснай" газеты:

"Всем известно, что НИСЭПИ является негосударственной исследовательской организацией и неоднократно заявлял о своей неангажированности. Более того, НИСЭПИ функционирует отнюдь не на средства белорусского госбюджета, а за счет получаемых грантов. Можно смело утверждать, что НИСЭПИ никогда не был замечен в скрытых симпатиях к сегодняшней белорусской власти, поэтому, опубликовав результаты своего опроса, НИСЭПИ нанес нокаутирующий удар по бесчестным попыткам фальсификаторов итогов выборов".

Сапраўды, фальсіфікатары вынікаў выбараў адпраўлены ў накаўт.

Калі вынікі апытання НІСЭПД аб'ектыўныя, неангажаваныя, то скажыце, як успрымаць лічбу, якую назвала Ярмошына? Не супадаюць і галасы, аддадзеныя за іншых кандыдатаў у прэзідэнты. Паводле афіцыйных вынікаў Цэнтральнай выбарчай камісіі, У.Някляеў набраў толькі 1,78 працэнта галасоў, а па падліках сацыёлагаў пад кіраўніцтвам прафесара Манаева — 8,3 працэнта. Зусім у другім свеце прадстаюць А.Саннікаў, В.Рымашэўскі, іншыя прэтэндэнты на пасаду прэзідэнта, калі знаёмішся з данымі НІСЭПД.

Вывад? А ён усім зразумелы.

Станіслаў ПАЛЬЧЭЎСКІ.

З-ЗА КРАТАЎ

Чаму адвакат Тацяна Станкевіч не можа ўбачыць Мікалая Статкевіча?

Адвакат экс-кандыдата на пасаду прэзідэнта Мікалая Статкевіча Тацяна Станкевіч у чарговы раз безвынікова наведала КДБ. У якім стане яе падабаронны і чаму яна не можа яго ўбачыць? Адказу няма дагэтуль.

З 20 снежня Мікола Статкевіч трымаў галадоўку пратэсту, патрабуючы прызнаць прэзідэнцкія выбары несапраўднымі і прызначыць новыя без удзелу ў іх Аляксандра Лукашэнкі. Але галадоўка не можа цягнуцца так доўга. Што са Статкевічам, у якім ён стане? Менавіта гэта на свае вочы хоча ўбачыць адвакат. Але такой магчымасці ёй не даюць.

Прадстаўнікам Сацыял-дэмакратычнай партыі Германіі і амбасадарам ЕС таксама не далі дазволу на спатканне з арыштаваным экс-кандыдатам на пасаду прэзідэнта. Праўда, не далі спаткання не толькі са Статкевічам, але і ні з адным з арыштаваных паводле гэтай справы.

Любоў ЛУНЁВА.

АНОНС

«Люди, будьте бдительны! В республике запахло фашизмом!»

Это название статьи, которую «Народная Воля» опубликовала 15 лет назад — в сентябре 1996 года. Ее автор — тогдашний председатель Верховного Совета Республики Беларусь Семен Шарецкий.

"...Вы помните, что 23 ноября 1995 года президент Беларуси А.Г.Лукашенко в интервью немецкой газете "Хандельсблат" сказал: *"...немецкий порядок формировался веками. При Гитлере это формирование достигло наивысшей точки. Это то, что соответствует нашему пониманию президентской республики и роли в ней президента",* — писал Шарецкий. — Вы помните, как после этого интервью А.Лукашенко идеологи из его окружения пытались отбелить своего шефа от коричневого налета. Дескать, он же вырос в Беларуси, как он может считать своим кумиром Гитлера?

Можно было бы поверить им, отнести увлечение "фюрером" на счет молодости президента, но его конкретные шаги по усилению личной власти не позволяют сделать этого. За несколько месяцев до интервью немецкой газете указом президента численность сотрудников его Службы безопасности была увеличена... Этим же указом Служба безопасности президента наделена правом осуществления оперативно-розыскной деятельности. Это значит — наделена правом в любую минуту у каждого из нас сделать обыск, а то и задержать на некоторое время. И все это без разрешения на то прокурора. И это беззаконие уже действует. Производятся без санкции прокурора обыски, люди задерживаются без всяких на то оснований; методами воздействия на непослушных стали провокации, угрозы, шантаж. Более сговорчивых подкупают и одаривают должностями.

Дело дошло до того, что некоторым людям приходится задумываться не только о том, сколько ты еще проработаешь, но и вообще, сколько проживешь на белом свете".

Интервью с Семеном Шарецким читайте на 6-й странице "Народной Воли".

Народная Воля http://www.nv-online.info
25—27 СТУДЗЕНЯ 2011 г.

Рэзалюцыя Еўрапейскага парламента адносна сітуацыі ў Беларусі

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

3. Рэзка асуджае арышт і затрыманні мірных дэманстрантаў і большасці кандыдатаў у прэзідэнты (напрыклад, Уладзіміра Някляева, Андрэя Саннікава, Мікалая Статкевіча, Аляксея Міхалевіча), лідараў дэмакратычнай апазіцыі (напрыклад, Паўла Севярынца, Анатоля Лябедзькі) і вялікай колькасці грамадзянскіх актывістаў, журналістаў, настаўнікаў і студэнтаў, якім пагражаюць прысуды да 15 гадоў зняволення; заклікае да незалежнага і аб'ектыўнага расследавання пад эгідай АБСЕ; заклікае да неадкладнага спынення палітычна матываваных прысудаў;

4. Асуджае рэпрэсіі і заклікае ўлады Беларусі неадкладна спыніць усе формы гвалту, пераследу і запалохвання актывістаў грамадзянскай супольнасці, рэйды, ператрусы і канфіскацыю матэрыялаў у прыватных памяшканнях, прадстаўніцтвах незалежных СМІ і офісаў грамадскіх арганізацый, а таксама выключэнняў з універсітэтаў і звальненняў з працы;

5. Патрабуе неадкладнага і безумоўнага вызвалення ўсіх зняволеных у дзень выбараў і пасля выбараў, у тым ліку і зняволеных, прызнаных "Міжнароднай амністыяй" вязнямі сумлення; заклікае улады Беларусі забяспечыць неабмежаваны доступ сваякоў, юрыстаў і медыкаў да зняволеных;

6. Выказвае шкадаванне адносна рашэння ўлад Беларусі закрыць офіс АБСЕ ў Беларусі і заклікае ўлады Беларусі адмяніць гэтае рашэнне;

7. Асуджае блакаду ў інтэрнэце шэрагу буйных інтэрнэт-старонак, у тым ліку сацыяльных сетак і апазіцыйных вэб-сайтаў у дзень выбараў у Беларусі; падкрэслівае, што цяперашні закон аб СМІ ў Беларусі не адпавядае міжнародным стандартам, і таму заклікае беларускія ўлады перагледзець і змяніць яго;

8. Заклікае Савет, Камісію і высокіх прадстаўнікоў ЕС перагледзець палітыку ЕС адносна Беларусі, у тым ліку ўжыць эканамічныя санкцыі і замарозіць усю макрафінансавую дапамогу праз крэдыты МВФ, аперацыі Еўрапейскага інвестыцыйнага банка і Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця; падкрэслівае, што арыентацыя на еўрапейскую палітыку добрасуседства і нацыянальнай дапамогі для Беларусі мусіць быць перанакіраваная і праводзіцца ў сферы падтрымкі грамадзянскай супольнасці; нагадвае пра істотнасць эфектыўнага выкарыстання еўрапейскай ініцыятывы ў справе дэмакратыі і правоў чалавека;

9. Заклікае Камісію падтрымаць усімі фінансавымі і палітычнымі сродкамі высілкі грамадзянскай супольнасці, незалежных СМІ (у тым ліку тэлеканала "Белсат", Еўрапейскага радыё для Беларусі, Радыё Рацыя і іншых) і недзяржаўных арганізацый у Беларусі, якія развіваюць дэмакратыю і супрацьстаяць рэжыму; бачыць неабходнасць актывізаваць і захвочваць сувязі беларускіх недзяржаўных арганізацый з міжнароднай супольнасцю; разам з тым заклікае Камісію прыпыніць цяперашнее супрацоўніцтва і адклікаць дапамогу дзяржаўным СМІ ў Беларусі; адначасова з гэтым Камісія мусіць прафінансаваць перавыданне і распаўсюд кніг Уладзіміра Някляева, канфіскаваных і знішчаных беларускімі ўладамі;

10. Заклікае Еўрапейскую Камісію развіваць механізм рэгістрацыі недзяржаўных арганізацыяў, якім адмоўлена ў рэгістрацыі ў Беларусі з палітычных прычынаў, каб даць ім магчымасць карыстацца праграмамі ЕС;

11. Заклікае Камісію працягваць і павялічваць фінансавую дапамогу Еўрапейскаму гуманітарнаму ўніверсітэту (ЕГУ), які месціцца ў Вільнюсе (Літва), павялічыць колькасць стыпендый для беларускіх студэнтаў, рэпрэсаваных за іх грамадзянскую актыўнасць і выключаных з універсітэтаў і зрабіць унёсак у канферэнцыю донараў "Салідарнасць з Беларуссю", запланаваную на 2.02.2011 г. і наступную канферэнцыю ў Вільнюсе 3-4.02.2011 г.;

12. Заклікае Савет, Камісію і Вярхоўнага прадстаўніка ЕС неадкладна аднавіць візавыя забароны ў дачыненні да кіраўнікоў Беларусі і пашырыць іх на дзяржаўных чыноўнікаў, а таксама супрацоўнікаў праваахоўных органаў і сіл бяспекі, якія могуць быць адказнымі за парушэнні падчас галасавання і паслявыбарныя жорсткія рэпрэсіі і арышты прадстаўнікоў апазіцыі, а таксама замарозіць іх банкаўскія актывы; звяртае ўвагу, што санкцыі павінны заставацца ў сіле як найменей да вызвалення ўсіх палітычных зняволеных і поўнага зняцця з іх абвінавачанняў; вітае добрыя прыклады ўрада Польшчы, які ўвёў у дзеянне візавыя абмежаванні для прадстаўнікоў рэжыму і разам з тым аблегчыў паездкі ў ЕС для беларускіх грамадзян;

13. Заклікае Раду разгледзець магчымасць прыпынення ўдзелу Беларусі ва Усходнім партнёрстве на саміце Усходняга партнёрства ў Будапешце, калі да гэтага не будзе прымальнага тлумачэння і значнага паляпшэння сітуацыі ў Беларусі, пры гэтым прыпыненне не распаўсюджваецца на няўрадавыя арганізацыі і грамадзянскую супольнасць;

14. Заклікае Камісію і Савет актывізаваць перамовы ў справе пагаднення аб рэадмісіі для спрашчэння візавага рэжыму, у тым ліку і даступных візавых збораў ў мэтах спрашчэння кантактаў паміж людзьмі;

15. Выказвае спадзяванне, што краіны-сябры ЕС не аслабяць дзеянні Еўрасаюза двухбаковымі кантактамі з беларускім рэжымам, што зменшыла б аўтарытэт і эфектыўнасць еўрапейскай замежнай палітыкі;

16. Выказвае меркаванне, што спартыўныя мерапрыемствы, такія як чэмпіянат свету па хакеі ў 2014, не могуць быць праведзеныя ў Беларусі, пакуль у гэтай краіне будуць заставацца палітвязні;

17. Выказвае шкадаванне ў сувязі з крокамі Расійскай Федэрацыі, якая прызнала выбары і расцаніла рэпрэсіі як "унутраную справу", рэкамендуе Еўракамісіі распачаць дыялог, кансультацыі і палітычную каардынацыю з суседзямі Беларусі, якія не ўваходзяць у ЕС, але якія традыцыйна маюць асаблівыя адносіны з гэтай краінай і адначасна з'яўляюцца партнёрамі ЕС, а менавіта, Расіяй і Украінай, каб максімальна павысіць эфектыўнасць палітыкі ЕС у дачыненні да Беларусі, а таксама супрацоўнічаць у справе належнага ўраўнаважання рэакцыі на недахоп дэмакратыі і парушэнні правоў чалавека ў Беларусі з неабходнасцю пазбегнуць яе міжнароднай ізаляцыі;

18. Даручае старшыні накіраваць гэтую рэзалюцыю ў Савет Еўропы, Еўрапейскую Камісію, Вярхоўнаму прадстаўніку, дзяржавам-сябрам ЕС, прэзідэнту, парламенту і ўраду Беларусі, Парламенцкай Асамблеі Савета Еўропы і АБСЕ.

ЗАКУЛИСЬЕ

Иван Куликов и «мертвые души»

Бывший претендент на пост президента Беларуси Иван Куликов в течение восьми лет держал "мертвые души" в ГНУ "Объединенный институт энергетических и ядерных исследований — Сосны" Национальной академии наук Беларуси.

Иван Куликов баллотировался в президенты Беларуси в 2010 году, но снял свою кандидатуру на этапе сбора подписей. Напомним, что неделю назад ему было предъявлено обвинение в совершении преступления, предусмотренного ч.3 ст.210 Уголовного кодекса Беларуси (хищение путем злоупотребления служебными полномочиями, совершенное в крупном размере).

Как удалось выяснить "Ежедневнику", 61-летнему кандидату технических наук, доктору физико-математических наук профессору Куликову инкриминируется хищение средств ГНУ "Объединенный институт энергетических и ядерных исследований — Сосны" НАН РБ в размере 22,3 миллиона рублей.

Согласно данным следствия, И.Куликов с 17 апреля 2000 года по 4 июня 2008 года держал в штате лаборатории двух жителей Минска, которые на самом деле там не работали. Они были фиктивно оформлены на работу в ГНУ "Объединенный институт энергетических и ядерных исследований — Сосны" НАН РБ и в течение восьми лет им начислялась заработная плата. По данным правоохранительных органов Минска, на самом деле оформленные в институт лица там не работали, а все это время заработную плату за них получал сам Иван Куликов.

Насколько обоснованны претензии следствия, пока сказать сложно. Однако несостоявшийся кандидат в президенты Беларуси уже привлек к себе внимание общественности Европы и России, а его дочь поспешила уехать из Беларуси в Москву.

ПА-ЗА СЦЭНАЙ

Валерый МАЗЫНСКІ:

«У міліцыі мне прапанавалі зрабіць бясплатны фотаздымак...»

На мінулым тыдні вядомага рэжысёра Валерыя Мазынскага выклікалі ў міліцыю — даць тлумачэнні з нагоды таго, што ён 19 снежня рабіў на Плошчы. Лаўрэат Дзяржпрэміі БССР пайшоў да следчага з зубной шчоткай — на той выпадак, калі пасля размовы адразу "запросяць" у СІЗА.



— Мне патэлефанавалі зранку і папрасілі прыйсці ў Фрунзенскі РАУС Мінска, — *распавёў "Народнай Волі" Валерый Яўгенавіч.* — Сказалі, што мой нумар тэлефона "прабіты" ў раёне масавых беспарадкаў. Я пайшоў, бо ведаю, што ў міліцыі зараз стосы спісаў тых, хто быў на Плошчы. І яны мусяць іх адпрацаваць — кампанія носіць такі ж масавы характар, як у свой час адбіткі пальцаў.

У мяне пацікавіліся, выпадкова я апынуўся на Плошчы ці па нейкіх ідэйных прычынах. Я сказаў, што зусім не выпадкова.

Пыталіся, што чуў, бачыў. Я сказаў, што сведкам злачынстваў не быў, антыканстытуцыйных лозунгаў не чуў і не выкрыкваў. Па Леніна пайшоў дамоў, бо ногі змерзлі — на вуліцы холадна было.

Варта адзначыць, што размова была нядоўгай. На развітанне мне прапанавалі зрабіць "бясплатны фотоздымак" — маўляў, потым яго будуць злічаць з тварамі тых, хто засвяціўся на Плошчы перад аб'ектывамі фота- і відэакамер. Уяўляеце, колькі яшчэ следчым працаваць?! Натуральна, фатаграфавацца я адмовіўся — прапанаваў следчаму адшукаць здымак у інтэрнэце. На тым і разышліся...

Перад тым як ехаць у міліцыю, я цёпла апрануўся і нават узяў з сабой зубную шчотку і пасту. Ведаю, што можа быць усялякае, размова можа скончыцца як добра, так і дрэнна.

Страху перад паходам "у госці" да міліцыянераў не было. Толькі нейкая гідлівасць і трывожнасць: як ні круці, а сэрца ж усё роўна рэагуе!

Варта адзначыць, што мяне распытвалі пра ўсё вельмі ветліва, быццам бы разумеючы, што да чаго. Але ад гэтага яшчэ больш гідка...

Марына КОКТЫШ.

ПОДСЧИТАЛИ...

Треть золотовалютного запаса Нацбанка — долги

Примерно треть золотовалютного запаса Национального банка Беларуси сформирована за счет денег, одолженных в том или ином виде у иностранных юридических лиц. Об этом, согласно сообщению Агентства финансовых новостей, свидетельствуют опубликованные показатели денежного обзора НБ РБ за 2010 год.

На 1 января 2011 года обязательства (задолженность) Нацбанка РБ перед иностранными партнерами достигли 7343,6 миллиарда рублей, или 2.448.000.000 долларов, увеличившись только за ноябрь-декабрь прошлого года на 3981 миллиард рублей, или на 1.327.000.000 долларов.

В целом за 2010 год задолженность Нацбанка перед внешними кредиторами выросла в 4,5 раза.

Нафта пайшла ў абход Беларусі

Беларускія нафтаперапрацоўчыя заводы застаюцца на галодным пайку.

Міхаіл Мясніковіч і Уладзімір Пуцін так і не дамовіліся аб умовах пастаўкі расійскай нафты на беларускія НПЗ. Запасаў, якія маюць заводы, хопіць да канца студзеня.

Больш за тое, расійская кампанія "Транснефть" пачала пастаўкі нафты, якая дагэтуль прызначалася для Беларусі, альтэрнатыўным пакупнікам праз марскія парты. Як паведаміў прэс-сакратар расійскага аператара нафтаправодаў Ігар Дзёмін, такое рашэнне было прынята пасля таго, як перамовы прэм'ераў Беларусі і Расіі па цане на нафту скончыліся безвынікова. І, падобна, блізкай перспектывы вырашэння гэтай спрэчкі расійская кампанія не бачыць. Такім чынам, ужо месяц паміж Беларуссю і Расіяй ідзе нафтавая вайна, пастаўкі сыравіны спынены. А шырокая грамадскасць гэтага нават і не заўважыла.

Ігар МАРОЗАЎ.

У Тураве няма працы?

Другі тыдзень у Тураве галадае былы рэдактар мясцовай незалежнай газеты "Вольныя навіны" Міхаіл Козел. Галадоўку ён распачаў з прычыны, пра якую ў сучаснай Беларусі лічаць за лепшае не гаварыць, — ён не можа знайсці працу ў родным горадзе і наваколлі.

Гарадское кіраўніцтва адрэагавала на сітуацыю. Але...

— Я галадаю не моўчкі, вывесіў плакат на хаце, — расказаў "Народнай Волі" Міхаіл Козел. — І ў Тураўскі гарвыканкам схадзіў, расказаў, што мяне падштурхнула да такога кроку. Потым да мяне прыйшоў старшыня гарвыканкама Ігар Леанідавіч Міцюрыч. Ён адзіны звярнуў увагу на мой пратэст. Абяцае дапамагчы, але толькі ўвесну. Бо зараз на Тураўшчыне аб'ядналі калгасы, і з працай сапраўды цяжка.

— І што — да вясны галадаць?

— Атрымліваецца, што так... Грошай у мяне няма нават на ежу. Я ўжо цэлы год не магу працаўладкавацца. Пасля выбараў 2006 года, калі ўваходзіў у ініцыятыўную групу Мілінкевіча, быў вымушаны з'ехаць — працы для мяне ў родных мясцінах не было. Уладкаваўся ў Мінску будаўніком. Але, ведаеце, я хачу жыць і працаваць у Тураве, таму вярнуўся. Аднак нічога не змянілася. Мяне і зараз непажадана браць на працу, бо я лічуся апазіцыянерам. Быў выпадак, калі мясцоваму відэацэнтру быў патрэбны фатограф, і я па аб'яве звярнуўся да кіраўніка цэнтра. А ён сказаў, што мусіць узгадніць маю кандыдатуру ў ідэалагічным аддзеле Жыткавіцкага райвыканкама. Ну і, зразумела, на працу не ўзялі.

— Не спрабавалі ў мясцовую службу занятасці звярнуцца? Можа, яны што прапанавалі б? Хапае ж непрэстыжных работ, але якія даюць заробак...

— З гэтага і пачалося. Мне ў службе занятасці прапанавалі пайсці жывёлаводам у СУП "Каленскае". Далі тэлефоны, сказалі, што адтуль у цэнтр прыйшла заяўка. Я з'ездзіў у "Каленскае", але мяне на працу не ўзялі. Спаслаліся на тое, што быццам бы месц у іх няма. І я быў вымушаны абвясціць галадоўку. Вырашыў трымаць яе максімальны тэрмін, толькі калі са здароўем пачнуцца праблемы — спыню.

— А не спрабавалі самастойна знайсці працу?

— Спрабаваў, канечне. Але ў Тураве небагата прадпрыемстваў, таму і беспрацоўных хапае. Хто з'язджае, хто на разавыя працы пагаджаецца, хто за кошт бацькоў-пенсіянераў жыве. І не пратэстуюць. А я стаміўся. Летам таксама ў фермераў працаваў, калі ім патрэбна была дапамога. Але ж гэта праца на дзень. Яны збіраюць людзей уранку, а ўвечары разлічваюцца. Грошы невялікія, але ж узімку і гэтага няма.

— Як рэагуюць на галадоўку вашы знаёмыя і наогул людзі ў Тураве?

— Па-рознаму. Ёсць тыя, хто дапамагае і маральна, і чым можа. Але ёсць і такія, якія кажуць: "Што? Амерыканскія грошы скончыліся? Дык ідзі працуй у калгас". І не вераць, што мяне не бяруць нават у калгас жывёлаводам з-за палітычна матываваных прычын. Не вераць, што такое можа быць...

АФІЦЫЙНА

Ігар Міцюрыч, старшыня гарвыканкама г.Турава:

«Для мяне няма розніцы, якіх хто поглядаў, чалавек хоча працаваць — хай працуе»

Мясцовыя ўлады сапраўды ведаюць пра галадоўку Міхаіла Козела.

— Мы робім усё магчымае, каб яго працаўладкаваць, — пракаментаваў сітуацыю старшыня гарвыканкама Турава Ігар Міцюрыч. — І праца ў раёне ёсць, хаця зараз сапраўды пэўныя складанасці ўзніклі. Мы сельскагаспадарчы раён, таму работы ў асноўным сезонныя. Але мы дапамагаем Козелу ў пошуках. Я асабіста гэтым займаюся.

— Міхаіл мяркуе, што яго іншадумства — асноўная прычына таго, чаму яго не бяруць на працу...

— Ведаеце, для мяне няма розніцы, якіх хто поглядаў, чалавек хоча працаваць — хай працуе. І мы яму дапамагаем.

Ігар ЗАЛЕСКІ.

Увага, фальшыўкі!

У Оршы затрыманы камерцыйны дырэктар ТАА "Русский вояж", які вёз у Беларусь буйную партыю падробленых расійскіх рублёў.

Супрацоўнікі праваахоўных органаў Беларусі затрымалі камерцыйнага дырэктара ТАА "Русский вояж". Паводле даных МУС, жыхар Санкт-Пецярбурга перавозіў у сваім "БМВ" 177 падробленых білетаў Банка Расіі, кожны наміналам 5 тысяч расійскіх рублёў. Агульная сума фальшывых грошай склала 885 тысяч расійскіх рублёў.

Кур'ер быў затрыманы і змешчаны ў ізалятар часовага ўтрымання. У дачыненні да расійца распачата крымінальная справа па ч.2 арт.221 (выраб, захоўванне або збыт падробленых грошай ці каштоўных папер, здзейсненыя паўторна, альбо арганізаванай групай, альбо ў асабліва буйным памеры).

Паводле даных праваахоўных органаў, гэты кур'ер уваходзіць у склад арганізаванай злачыннай групы, якая займаецца вырабам і ўкараненнем у фінансавы абарот падробленых грошай.

ФЕЛЬЕТОН

Ляціце, гусі-лебедзі!

Кашчэй Бессмяротны, нібы стары лось, прашчамліўся скрозь гушчар да хаткі на курыных ножках, дзе жыве Баба Яга, і застыў, як айсберг у акіяне: дзівіўся. Яга, пачапіўшыся на дзве мыліцы, прывязвала да шыяў сваіх памочнікаў гусей-лебедзяў вяроўкі, на якіх матляліся пустыя торбы. Потым, сыпануўшы ў кармушку нейкага зерня, загадала:

— Добра наядайцеся, бо шлях няблізкі, сіл спатрэбіцца шмат.

— Чаму гэта ў цябе гусі-лебедзі з торбамі, нібы коні? Некалі для коней у такія насыпалі авёс. І сама на мыліцах...

— Пайшлі ў хатку, бо тут холадна, раскажу, што да чаго.

— Клопат у мяне, Кашчэйка. Ды каб жа свой, а то грамадскі, — пераступіўшы парог, пачала апавядаць Яга. — Учора я лятала на ступе ў горад Дзятлава: спраў сабралася шмат. Прыпаркаваўшы ступу на гарадской плошчы, накіравалася на вуліцу Гагарына, бо і там мела гешэфт. Але спачатку трэба было прайсці вуліцу Леніна. То па тым участку, які бліжэй да цэнтра і які заасфальтаваны і пачышчаны, ісці было добра. А калі мінула скрыжаванне, на такі лёд уздзябурылася, што і сказаць страшна. Не прайсці тую вуліцу ні ўздоўж, ні ўпоперак. Прахожыя ледзь не на платы лезуць, каб не ўпасці.

— Пачакай абурацца, Ягуся, — перапыніў яе Кашчэй. — Чула пра лінію Сталіна? То, можа, у Дзятлаве зрабілі лінію Сталіна? Непрыступную.

— Не ведаю, што і думаць. Наслізгалася я па лёдзе, дапамагла ўстаць нейкай бабулі, што, казала, век гімнастыкай не займалася, а тут раптам на шпагат села. Павярнулася і пайшла на гарадскі рынак. Гранатаў хацела купіць.

— Гранатаў?! — ажно прыўстаў з зэдліка Кашчэй. — Ты што, старая, тэрарысткай будзеш?!

— Дурань! Гранаты — гэта садавіна такая заморская. Смачныя яны і карысныя. Хіба ты не еў ніколі?

— За маю пенсію толькі гранаты і есці, — незалюбіў Кашчэй. — Купіла? То дай пакаштаваць.

— Купіла ўсяго адзін і адразу з'ела. Дарагія, халера, але надта ж хацелася. Потым вырашыла схадзіць у банк, які непадалёку ад аўтавакзала, бо Сарока на хвасце прынесла навіну, што пенсію ўжо выплачваюць. Каб было хутчэй, пасунулася напрасткі, праз завулак Камсамольскі. А там!.. Галалёд яшчэ горшы, чым на вуліцы Леніна. І гэта, лічы, у самым цэнтры горада. Як ступіла на нейкі лядзяш ды як грымнулася вобзем... Нагу, вось бачыш, паламала. Касцяную. А што ўжо казаць пра людзей, якія звычайныя ногі маюць? Ледзь потым да ступы давалаклася. А нейкі чалавек так упаў на вуліцы Гагарына, што яго "хуткая дапамога" забрала. Во як!

— І што, у Дзятлаве скрозь такая галалёдзіца, на ўсіх вуліцах?

— Не, канешне. У цэнтры і тратуары пачышчаны, і пясочкам дзе трэба пасыпаны. Камунгасаўцы мясцовыя пастараліся, бо ў цэнтры ж начальства ходзіць-ездзіць ды ўсякі старонні люд. І абласное кіраўніцтва зазірнуць можа. У цэнтры парадак, грашыць не буду. Удакладню толькі: у самым цэнтры. А на тых вуліцах, дзе жывуць радавыя дзятлаўчане... Ні ў казцы сказаць, ні пяром апісаць.

— А ты не цікавілася: можа, так ва ўсіх нашых гарадах? Галалёд жа спецыяльнага месца не выбірае, усюды разлёгся.

— Не, міленькі, так не ўсюды. Вось я надоечы пралятала на ступе над суседнім Слонімам, то проста дзіву далася: вуліцы там ачышчаны, пяском пасыпаны. У многіх месцах бачыла, як дворнікі лёд сколваюць. Слонімцы па сваіх вуліцах ходзяць лёгка, нібыта не зіма на двары, а лета ці, скажам, восень.

— Ну, то чаму ж тады ў Дзятлаве слізка? Як ты сама, Ягуся, думаеш?

— А што тут думаць? Пяску няма. Дэфіцыт. Навокал горада сопкі ды горы. Дзе яго возьмеш?

— То няхай бы дзятлаўскія камунгасаўцы паслалі ў пустыню Сахару колькі самазвалаў ды прывезлі пяску адтуль. Там жа ён, пэўна, недарагі. Нафту ж з Венесуэлы возім, і нармальна.

— І я пра гэта думала. Але ж пазваніла ў камунгас і пытаюся ў дыспетчара: "Што гэта ў вас робіцца?! Чаму вуліцы ў галалёдзіцу не пасыпаеце?" А дыспетчар і кажа: "Пасыпаем. І ўчора пасыпалі, і сёння".

— Падманула? От! І ўправы на іх няма ніякай.

— Няўжо ж. На падмане і едуць, як расійскі алігарх Абрамовіч на "мерседэсе". І тады я вырашыла адправіць сваіх гусей-лебедзяў у Сахару з торбамі. Набяруць там пяску і назад вернуцца. Далёкая тая Сахара, канечне, і ляцець няпроста, але ж нешта рабіць трэба, раз дзятлаўскія камунгасаўцы не клапоцяцца пра людзей.

— Ну, прынясуць гусі-лебедзі пяску, і што далей?

— А далей я на ступе аблячу ўсе гарадскія вуліцы, асабліва на ўскраіне, і пасыплю іх, каб людзі маглі смела і ў магазін схадзіць, і на працу, і дзетак у садок ды школу адправіць. Ды і старым трэба пра розныя справы дбаць, бо, як здавён вядома, пад ляжачы камень і вада не цячэ.

Баба Яга крыху падумала і няўпэўнена папрасіла:

— Можа, і ты Кашчэйка, дапамог бы? Удваіх мы ў ступе памесцімся. Хутчэй было б і лацвей.

— Чаму ж не, канечне дапамагу, бо і мне вельмі шкада простых дзятлаўчан, якія вымушаны поўзаць па ледзяной гладзі ды калечыцца. А яшчэ я вось што думаю: у Дзятлаве ж можна чэмпіянат свету па канькабежным спорце праводзіць. Валюта ў горад пацякла б, замежныя турысты хлынулі б, як вада ў разводдзе. Тады і на пясок грошай хапіла б, каб з Сахары прывезці столькі, колькі трэба, і на ломікі ды рыдлёўкі, каб тратуары пачысціць. Во зажылі б дзятлаўскія камунгасаўцы!

— Ну, гэта ў перспектыве, — згадзілася Баба Яга, — а пакуль што мне трэба гусей-лебедзяў у дарогу выправіць.

Яна выйшла на ганак хаткі, пляснула ў далоні, і паслухмяныя пярнатыя памочнікі з торбамі на шыях узялі курс на Сахару.

— Ляціце, гусі-лебедзі, ды хутчэй вяртайцеся назад, бо Дзятлаву вельмі патрэбна ваша дапамога. Калі не мы, то хто паклапоціцца пра мясцовы люд?

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ.

Дзятлаўскі раён.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
25—27 СТУДЗЕНЯ 2011 г.

ЭКСПЕРТЫЗА

Якія беларускія прадпрыемствы могуць пацярпець у выпадку ўвядзення санкцый Еўрасаюза?

Еўрапарламент прапануе разгледзець магчымасць эканамічных санкцый у дачыненні да беларускага ўрада. Адна з самых буйных фракцый — Еўрапейская народная партыя — лічыць магчымым, напрыклад, уздзейнічаць на беларускія ўлады праз замарозку актываў і маёмасці "Белтэхэкспарту" і іншых беларускіх экспарцёраў узбраенняў.

Эксперты сайта "Заўтра тваёй краіны" вызначылі найбольш уразлівыя ў выпадку разрастання канфрантацыі Брусэля і Мінска беларускія прадпрыемствы.

З усіх галін беларускай эканомікі ў найбольшай ступені завязаныя на еўрапейскі рынак сёння нафтаперапрацоўка, нафтахімія, металургія і трактарнае машынабудаванне.

Долі беларускіх дзяржаўных прадпрыемстваў у сумесных збытавых і зборачных вытворчасцях, склады прадукцыі і запчастак — патэнцыяльныя аб'екты, якія могуць трапіць пад магчымыя санкцыі.

Розныя прадпрыемствы канцэрна "Белнафтахім" з'яўляюцца сузаснавальнікамі ТАА "Ойл Лагістык" (Рыга, Латвія), ЗАТ "Трансхема" (Вільня, Літва) і ТАА "БНХ-Ойл Польска" (Варшава, Польшча), а таксама ЗАТ "Беларуская нафтавая кампанія", якая ў сваю чаргу мае прадстаўніцтвы ў Лондане і Варшаве. Гэтая тавараправодная сетка — найбуйнейшы прадстаўнік інтарэсаў беларускай дзяржавы на еўрапейскім рынку. Праз яе еўрапейскім спажыўцам пастаўляюцца нафтапрадукты, хімічныя валокны і іншыя прадукты дзвюх галоўных галін эканомікі Беларусі.

Ва ўсіх вышэйпералічаных трэйдарах заснавальнікамі выступаюць выключна дзяржаўныя прадпрыемствы або прадпрыемствы з кантрольнай доляй дзяржавы (напрыклад, Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод). Пры гэтым практычна ўсе яны з'яўляюцца ключавымі плацельшчыкамі ў беларускі бюджэт.

ААТ "Беларускалій" у латвійскім "Ойл Лагістык" належыць 55%-ная доля, канцэрну "Белнафтахім" — 25%, РУП ПА "Беларуснафта" — 10%, ААТ "Нафтан" — 10%.

Заснавальнікамі літоўскай "Трансхемы" з'яўляюцца УП "Беларускі нафтавы гандлёвы дом" (51%) і "Беларуснафта" (49%).

Польская кампанія "БНХ — Ойл Польска" належыць "Беларускаму нафтаваму гандлёваму дому" (61%), ААТ "Гроднаазот" (15%), ААТ "Лідская Лакафарба" (14%), РУП "Светлагорскае хімвалакно" (5%) і "Нафтану" (5%).

Беларуская нафтавая кампанія створана ў 2007 годзе "Беларуснафтай", "Беларускім нафтавым гандлёвым домам", "Нафтанам" і беларуска-расійскім СП "Мазырскі НПЗ".

Акрамя таго, у асобных прадпрыемствах канцэрна "Белнафтахім" ёсць іншыя актывы на тэрыторыі Еўрасаюза. "Беларуснафта" ў канцы мінулага года зарэгістравала ў Польшчы даччыную кампанію ТАА "Беларуснафта Польшча" (Варшава), мэтай якой з'яўляецца выхад на аптовы і ў перспектыве на рознічны рынак гандлю нафтапрадуктамі і звадкаваным газам.

"Беларускалію" належаць 40% акцый у ТАА "Балткаліс" (Вільня, Літва), якое займаецца пастаўкамі калійных угнаенняў і тэхнічнай солі на прыбалтыйскі рынак. У Вене знаходзіцца офіс Belurs Handels Gmbh. Праз гэтую кампанію салігорскае аб'яднанне пастаўляе тэхнічную соль на заходнееўрапейскі рынак.

У Вільнюсе знаходзіцца кампанія Beltyre, якая выконвае функцыі дыстрыбуцыйнага цэнтра прадукцыі бабруйскай "Белшыны" на еўрапейскі, а таксама паўночнаамерыканскі і лацінаамерыканскі рынкі. У Еўропе ў зоне адказнасці даччынай кампаніі бабруйскага вытворцы знаходзяцца таксама Эстонія, Фінляндыя, Латвія, Нарвегія, Швецыя, Францыя, Іспанія, Італія, Партугалія, Германія, Бельгія, Нідэрланды.

У найбуйнейшага металургічнага вытворцы Беларусі — РУП ПА "Беларускі металургічны завод" — у 2009 годзе пастаўкі ў далёкае замежжа склалі 739,6 млн долараў, продаж на ўнутраным рынку — 220,7 млн долараў, а ў СНД — 160,7 млн долараў. Замежнаэканамічная экспансія БМЗ забяспечваецца сеткай даччыных прадпрыемстваў — чатыры з васьмі размешчаны на тэрыторыі Еўрасаюза. Гэта Belastahl Aussenhandel Gmbh (Берлін, Германія), Belmet Handelsgesellschaft mbh (Лінц, Аўстрыя), ЗАТ "Гандлёвы дом "БМЗ-Балтыя" (Шаўляй, Літва) і Belorussian Steel Works Trading sro (Прага, Чэхія). Акрамя таго, у Еўропе знаходзяцца офісы асноўных металатрэйдараў, якія з'яўляюцца галоўнымі партнёрамі жлобінскага завода: Stemcor, Duferco, DR Karl J. Pisec і Carbofer.

У меншай ступені залежыць ад еўрапейскага спажыўца РУП ВА "Мінскі трактарны завод". Тым не менш еўрапейскі рынак таксама вельмі важны для аднаго з найбуйнейшых сусветных вытворцаў трактароў.

Рэктар БДУ паабяцаў не адлічаць студэнтаў, якія былі на Плошчы

Студэнтаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта не будуць адлічваць за ўдзел у несанкцыянаваным мітынгу 19 снежня ў Мінску, але яны будуць пакараныя за парушэнне правілаў унутранага распарадку ВНУ.

Пра гэта паведаміў рэктар БДУ Сяргей Абламейка ў сваім відэаблогу на афіцыйным сайце ВНУ.

"На жаль, на Плошчы апынуліся некаторыя студэнты БДУ, і мы цяпер праводзім аналіз, чаму і як яны там апынуліся", — заявіў Абламейка.

Рэктар паведаміў, што гэтыя студэнты парушылі правілы ўнутранага распарадку БДУ, згодна з якімі яны *"абавязаны не здзяйсняць дзеянняў, за якія прадугледжаная адміністрацыйная або крымінальная адказнасць, а таксама наведваць заняткі ў вызначаныя тэрміны і выконваць патрабаванні, прадугледжаныя праграмамі і планамі"*.

Цяпер факультэты сабралі тлумачальныя ва ўдзельнікаў мітынгу і рыхтуюць іх да прадстаўлення ў рэктарат, піша БелаПАН.

Што да пакарання, то *"гэта будуць вымовы ці заўвагі"*, паабяцаў рэктар БДУ Сяргей Абламейка.

САЛІДАРНАСЦЬ

Латвія спрасціла візавы рэжым для грамадзян Беларусі

Міністэрства замежных спраў Латвіі ўвяло спрошчаны візавы рэжым для грамадзян Беларусі.

Ужо з панядзелка беларусам пры афармленні доўгатэрміновай візы не давядзецца плаціць за гэта дзяржаўную пошліну. Адначасова разглядаецца магчымасць забараніць кіраўніцтву Беларусі ўезд у еўрапейскія краіны.

РЭЙТЫНГ

Добра жывём?

Беларусь па якасці жыцця апынулася паміж Угандай і Індыяй

Беларусь заняла 141-ы радок у сусветным рэйтынгу якасці жыцця. Усяго ў спісе, складзеным часопісам International Living, 192 краіны. Пры вызначэнні пазіцыі ў рэйтынгу ўлічваліся такія паказчыкі, як кошт жыцця, культурнае развіццё, эканамічны стан, экалогія, клімат, грамадзянскія свабоды, якасць сістэмы аховы здароўя і гэтак далей.

У першую дзясятку краін, дзе жыць найлепей, увайшлі:

1. ЗША
2. Новая Зеландыя
3. Мальта
4. Францыя
5. Манака
6. Бельгія
7. Германія
8. Аўстрыя
9. Вялікабрытанія
10. Японія

Беларусь апынулася толькі на 141-м месцы ў атачэнні Уганды, Індыі, Узбекістана, Ірана і Алжыра. Недалёка ад нас Паўночная Карэя і Бурундзі. Прычына такога нізкага агульнага бала — стан грамадзянскіх свабод. Калі ўзровень развіцця культуры і адукацыі быў ацэнены экспертамі ў 67 балаў, узровень сістэмы аховы здароўя — у 74, то ўзровень грамадзянскіх свабод — толькі ў 8 балаў.

Лепей за ўсіх, калі арыентавацца на рэйтынг International Living, з постсавецкіх краін жывуць Эстонія — 32-е месца, Латвія — 33-е, Літва — 36-е.

ДЭМАКРАТЫЯ ПА-БЕЛАРУСКУ

Наталлю Ільініч звольнілі з працы

З настаўніцай гісторыі з вёскі Талька Пухавіцкага раёна, сябрам Партыі БНФ, не працягнулі працоўны кантракт. У мінулым годзе не без дапамогі незалежных СМІ Наталля змагла адстаяць сваё права на працу. Зараз, калі гэтая гісторыя крыху забылася, 49-гадовую настаўніцу папрасілі са школы...

Пра Наталлю Ільініч у мінулым навучальным годзе "Народная Воля" пісала не раз. Справа ў тым, што не па сваёй волі яна была ўцягнута ў дзікую гісторыю. Яе і яшчэ пяцярых настаўнікаў з розных школ Мінскай вобласці начальнік Мінскага абласнога ўпраўлення адукацыі Таіса Данілевіч паставіла перад ганебным выбарам: альбо праца ў школе, альбо членства ў апазіцыйных партыях, сябрамі якіх яны з'яўляюцца.

Скандал выйшаў за дзверы чыноўніцкага кабінета, пра яго напісала наша газета, тэму падхапілі іншыя СМІ. Рэзананс быў велізарны. На "размову" ў кабінеце Данілевіч вымушана была рэагаваць пракуратура, бо Наталля Ільініч напісала заяву на імя пракурора Мінскай вобласці з просьбай правесці пракурорскую праверку таго, што адбылося ў Мінаблвыканкаме.

Здавалася, што настаўнікі абаранілі свае правы. З працы іх ніхто не звольніў, хаця амаль усе яны засталіся сябрамі апазіцыйных партый.

Але, як высвятляецца зараз, гэта была часовая перамога справядлівасці.

— Сёння мне далі загад за подпісам дырэктара аб маім звальненні, — патэлефанавала ўчора ў "Народную Волю" Наталля Ільініч. — 27 студзеня скончыўся мой працоўны кантракт, і мне паказалі на дзверы. Не далі дапрацаваць нават да пенсіі па выслузе гадоў. Настаўнікі, калі іх стаж складае 35 гадоў, могуць ісці на пенсію ў 50. А ў ліпені мне якраз і споўніцца 50. Я нават прасіла не звальняць, даць дапрацаваць. Але новы дырэктар (яго прызначылі 1 верасня) вырашыў інакш. Магчыма, на такое рашэнне паўплывала тое, што 5 студзеня ў маім доме адбыўся вобыск, як я думаю, у сувязі з падзеямі 19 снежня. Прыйшлі як быццам бы шукаць зброю і наркотыкі, а забралі камп'ютар. Пакуль не ведаю, што мне далей рабіць.

Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.

"Народная Воля" будзе сачыць за лёсам Наталлі Ільініч.

СТОП-ЛІСТ

Котковец в Берлин не едет

Организаторы Берлинской агропромышленной выставки "Зеленая неделя" аннулировали приглашение для первого заместителя министра сельского хозяйства и продовольствия Беларуси Надежды Котковец.

Об этом БелаПАН сообщил пресс-секретарь Министерства иностранных дел Беларуси Андрей Савиных.

"Спорные вопросы по событиям 19 декабря начинают вмешиваться в вопросы международного сотрудничества в сфере продовольственной безопасности и развития сельского хозяйства. Такое ощущение, что ряд организаторов международных конференций хотят быть святее Папы Римского", — сказал Савиных.

Естественно, он считает происходящее абсурдом. Хотя на самом деле Европа предупреждала официальный Минск, что в случае фальсификации результатов выборов и последующих репрессий санкции будут самыми разными — в том числе и стоп-лист для белорусских чиновников.

Напомним, ранее было аннулировано приглашение министру иностранных дел Сергею Мартынову на ежегодную Мюнхенскую конференцию по безопасности. Кроме того, баварский министр экономики отозвал приглашение министру экономики Беларуси Николаю Снопкову принять участие в конференции в Мюнхене.

ДИСКУССИЯ

Л.П.ЧЕРНЫШ,
доктор экономических наук, профессор

Кто хочет превратить обучение в вузах в профанацию?

Проблемы высшего образования в последние годы обсуждаются во многих СМИ. Авторы говорят о снижении качества и уровня знаний студентов, о Болонской конвенции, о каких-то реформах, которые нужны как вне вузов, так и самим вузам.

А.Павлов, выступая в "Народной Воле" со статьей "Защитим высшую школу", называет тех, кто хочет превратить обучение в вузах в профанацию. Это те, кто:

— сокращает в вузах число естественных дисциплин;

— проводит тестирование знаний и считает его основой контроля знаний;

— ввел десятибалльную систему оценки знаний;

— сократил срок обучения до четырех лет и ратует за трехлетний срок обучения.

Полемизирует А.Павлов с В.Листопадовым, В.Здановичем, Г.Юргилевичем, А.Пересыпкиным.

Получается, что они — основные "профаны" от высшего образования.

Кто такой профан? Это человек, совершенно несведущий в чем-либо, невежда в какой-либо области. Профанация — это оскорбление святыни, непочтительное отношение к тому, что пользуется уважением. Термин "профанация" не отражает сути современной системы обучения в вузах Беларуси, тех, кто ею руководит, и тех, кто обучает.

Спора нет, система высшей школы требует совершенствования. Эта система очень сложна, и ее элементы в определенной мере уникальны. Вузы естественного, гуманитарного, технического, медицинского, обществоведческого и других профилей требуют специального подхода. Отсюда следует, что навязывать и обязывать законом, кодексом и приказами всех выполнять те или иные требования и нормы просто нельзя. Выполнение требований, норм должно оставаться за кафедрой, за профессором. В конечном итоге так это и происходит. Толкователь и исполнитель норм — преподаватель.

Остановлюсь с позиций экономиста на том, что А.Павлов считает профанацией. Для вуза экономического профиля число естественных и технических дисциплин в настоящее время излишне велико. Что и как сокращать — отдельная тема, причем это "вечная" тема. В 1951-м и 1952 годах на ежегодном совещании секретарей комсомола вузов и факультетов Москвы, где я присутствовал, студенты-вожаки технических вузов требовали от Шелепина, первого секретаря ЦК ВЛКСМ, и министра высшего образования, сидевших в президиуме, сократить число часов по марксизму, политэкономии, диамату и истмату и увеличить число часов по специальным дисциплинам. Диспропорции такого плана были и есть, но это не значит, что они должны быть в будущем. Выпускающая кафедра должна иметь право корректировать перечень непрофильных дисциплин и устанавливать число часов.

О тестировании знаний. Навязывать законодательно его нельзя. Есть дисциплины, где оно приемлемо, а где-то — нет. Контроля знаний тестирование не дает. Преподаватель знает каждого студента и редко ошибается в оценке его знаний.

Оценка знаний по пятибалльной или десятибалльной системе — это не проблема и не профанация. Это чисто технический инструмент.

Срок обучения. Сокращение срока обучения в вузах в настоящее время и в перспективе — это государственное преступление. Ввели четырехлетнее обучение по экономическим и некоторым другим специальностям. Государство на год раньше получит молодых специалистов и пополнит в какой-то мере ряды безработных. Вузы вынуждены сокращать преподавателей, как правило, пенсионного и предпенсионного возраста — высокой квалификации. Но это не главное. В современных условиях нужно увеличивать срок обучения в вузе экономического профиля до 6—8 лет (с учетом обучения в магистратуре). Специальные и сложные дисциплины требуют больше времени на их освоение в первую очередь преподавателем, ну и, конечно, студентом. Учебная нагрузка в 700—1000 часов для современного преподавателя — это рабский труд. Нет возможности читать и осмысливать огромные потоки информации, читать монографии и периодику, самим готовить электронные варианты заданий, лекций и тому подобное. В начале 50-х годов прошлого века появление новых научных дисциплин, технических средств заставило перевести экономические вузы с четырехлетнего на пятилетний срок обучения. Руководители государства и высшей школы того времени понимали ход технического и общественного прогресса.

Если на современном комбайне, где много электроники, в основном могут работать молодые подготовленные люди, а сам комбайн высвобождает работников, что имеет место во всех сферах производства и услуг, то никакие административные требования сохранять рабочие места нас не спасут. Кроме того, сейчас молодежь более политизирована, чем три-четыре года назад. Все всегда начинается со студенческих волнений. Все может быть, как в Тунисе.

Статья А.Павлова называется: "Защитим высшую школу!". Красивый лозунг. От кого защитим высшую школу, от самих себя? Как защищать и кто эти защитники? Это не риторика. Многие видят защиту в европейском образовательном процессе и пространстве. Панацею видят в унификации учебного процесса, в единых образовательных стандартах, в улучшении учебных планов и программ.

Иосиф Павлович Середич! Помогите, попросите преподавателей журфака БГУ ознакомиться с технологией унификации учебного процесса по дисциплинам журналистики Беларуси и любой европейской страны, хотя бы Польши. Посмотрим, что это такое — унификация. Читал, что в США обязательными дисциплинами для журналистов считают только родной язык и историю страны, все другие дисциплины каждый вуз выбирает сам.

Что касается единых образовательных стандартов, учебных планов и программ, то, видимо, по каким-то дисциплинам стандарты могут быть едины, но учебные планы и программы — это дело автора, доцента, профессора. Мы свою собственную систему образовательных стандартов не создали. Как же будем ее унифицировать с европейской?

Образовательный стандарт у нас составляет группа специалистов. Имею в виду экономику и управление (менеджмент). Организационно работу ведет учебно-методическое объединение (УМО). Работа — келейная. Продукт в основном получаем некачественный. Конкретно тема требует специального разбора. Как должно работать УМО? Ведущая кафедра по данной специальности — центральное звено УМО. Не группа во главе с ректором, проректором и малоизвестными или вообще неизвестными лицами, а преподаватели, имеющие научные труды и учебники по специальности, для которой делают образовательный стандарт. Все преподаватели по данной специальности, допустим "Бухгалтерский учет", в стране должны знать, кто авторы образовательного стандарта.

Допустим, образовательный стандарт обновляют раз в пять лет, а раз в два года все ведущие ученые и преподаватели собираются на заседание УМО и обсуждают проблемы преподавания дисциплины, учебники и учебные пособия. Определяют, что устарело и что появилось нового в теории и методике преподавания, что вносить в образовательный стандарт, в учебные программы. Так работает УМО Российской финансовой академии. На ее совещания приезжали (в конце 90-х годов) специалисты из всех бывших республик СССР, преподаватели БГЭУ там бывали. Ничего подобного у нас нет. Только широкое, открытое обсуждение состояния дел в определенной дисциплине, по которой составляют образовательный стандарт, позволит достигнуть качественного преподавания дисциплины.

А.Павлов призывает "срочно двигаться дальше к европейскому образовательному процессу". Насколько срочно? Вы, уважаемый Анатолий Павлов, стажировались в университете г.Амьена (Франция), так напишите, как там работает профессор, какая у него учебная нагрузка, сколько людей ему помогает, сколько он получает. Прикиньте, когда нечто подобное будет у нас. Тогда мы узнаем, как "скоро", "срочно" мы будем в том пространстве. Согласен с вами, что не "некий институт высшей школы" должен "двигать нас в Европу", но не согласен, что это должна делать "авторитетная комиссия из ведущих наших профессоров". Это должно делаться в рамках УМО, ведущей кафедры и всех, подчеркиваю, всех преподавателей данной дисциплины.

Вы предлагаете отобрать 1—1,5 тысячи талантливых молодых людей и направить их в лучшие университеты мира, затем они вернутся и "реализуют идеи и знания на родине". Вы вернулись из Амьена — и какой результат? А ведь вы были проректором БГУ.

В середине XIX века японцы направили в Европу и Америку несколько сотен молодых людей, и они действительно вывели страну на новый уровень. В современной Беларуси "спасение утопающих — дело рук самих утопающих".

Защитит высшую школу профессор, доцент, преподаватель. Больше некому. Но профессор должен получить права, независимость, неприкосновенность. Он — главная фигура в системе образования. Избрание профессора на должность на 5—10 лет только по конкурсу, тайным голосованием и никаких контрактов. То же — доценту. Свободное обсуждение научных проблем, обязательная публикация лекций, авторское составление учебных планов и программ читаемых курсов.

Публикации, издание учебников, учебных пособий должно быть только авторским. Никаких грифов министерств, никаких рецензентов. Автор несет за все ответственность, а общественность видит качество его труда. Только так можно повысить качество образования. Лекции, учебники, написанные профессором, должны печатать в обязательном порядке госиздательства.

Оклад профессора должен быть на уровне министра (так было в конце 40-х — начале 50-х годов). При выходе на пенсию нужно сохранять доплату за ученое звание. Лица с ученой степенью и званием имеют право на дополнительную жилую комнату. Такая норма была в законодательстве 30-х годов и сохранялась позже. Дополнительная жилая площадь нужна для личной библиотеки. Это понимали правители до 1917 года и после него. 5—10 тысяч книг по специальным и смежным дисциплинам, другая справочная литература — это атрибут профессора. Труд профессора и доцента — постоянное обновление, накопление и передача знаний. Знания в книгах, а книги сейчас очень дорого стоят. Ежегодный статистический справочник Беларуси стоит 99.000 рублей. До середины 50-х годов аспиранты получали 13-ю стипендию — "книжные", как ее называли.

Профессор обязан работать в составе ученого совета, настоящего ученого совета, в котором состоят только лица с ученой степенью и званием и на котором обсуждаются только научные проблемы. Вопросы хозяйствования и т.п. решает дирекция, а не ученый совет. Защита диссертаций во всех ученых советах должна быть публичной, как это было до начала 70-х годов. В середине 90-х годов в БГЭУ шла защита кандидатской диссертации большим чиновником. Возле входа в зал совета стояли, беседуя, два проректора, вроде бы случайно встретились, давно не виделись. Такую стражу в дверях не то что студент, но и профессор с другого факультета не преодолеет. Так понимают публичность защиты диссертаций в наши дни.

Коллектив вуза создает традиции. Здесь многое зависит от руководителя вуза, факультета, кафедры. Если руководителя вуза меняют каждые два-три года, а он приводит свою команду, то такая "традиция" пагубна. Еще раз сошлюсь на Российскую финансовую академию, где с 1946 года и до 2008 года было всего три ректора. Они были ваятелями и хранителями традиций академии. На заседание УМО министры и руководители банков ходят. Это уже традиция.

Кандидатуру на пост руководителя вуза может рекомендовать глава государства, правительства, министерства, но только рекомендовать. Последующее избрание должно проходить через процедуру тайного голосования. Все должности, связанные с учебным процессом, должны замещаться по конкурсу. Никаких контрактов.

Может быть, многое из сказанного мной есть в "кодексе В.Здановича", ну а чего нет — добавьте, уважаемые читатели.

2011 год могуць абвясціць Годам культуры і мовы ў Беларусі

Падрыхтаваны прапановы абвясціць 2011 год у Беларусі Годам культуры і мовы. Пра гэта гаворыцца ў адказе намесніка міністра культуры Тадэвуша Стружэцкага ад 21 студзеня на зварот ГА "Таварыства беларускай мовы".

Гэты зварот накіраваў старшыня ТБМ Алег Трусаў яшчэ 29 верасня ў грамадскую прыёмную Аляксандра Лукашэнкі, які быў на той момант кандыдатам у прэзідэнты. У інтэрв'ю БелаПАН спадар Трусаў выказаў задаволенасць адказам Стружэцкага і спадзеў, што бягучы год сапраўды абвесцяць Годам культуры і мовы. Тым больш што сёлета будзе адзначацца 120-я гадавіна з дня нараджэння беларускага паэта Максіма Багдановіча.

Алег Трусаў мяркуе, што абвяшчэнне такога года садзейнічала б замацаванню беларускай мовы ва ўсіх сферах жыцця. Галоўнымі акцыямі, на думку кіраўніка ТБМ, павінны стаць прыняцце паправак у закон аб беларускай мове, каб забяспечыць сапраўдную роўнасць дзвюх дзяржаўных моў, а таксама прыняцце закона ці пастановы ўрада аб дзяржаўнай падтрымцы роднай мовы.

Нагадаем, што раней мы пражылі Год дзіцяці, Год зямлі, мінулы год быў Годам якасці...

ЗДАРЭННЕ

У Гродзенскай вобласці п'яны мужчына напаў з нажом на двух супрацоўнікаў ДАІ

Інспектары, якія патрулююць раён, затрымалі нецвярозага пешахода і спрабавалі даставіць яго на медыцынскі агляд. Аднак той па незразумелай прычыне вырашыў супраціўляцца з халоднай зброяй у руках. У выніку аднаму з інспектараў мужчына парэзаў твар.

Як паведамілі ў ДАІ Гродзенскага аблвыканкама, хулігана затрымалі ў гарадскім пасёлку Юраціškі Іўеўскага раёна Гродзенскай вобласці. Інспектары спынілі пешахода, паколькі ён ішоў уздоўж праезнай часткі без святлоадбівальных элементаў. Калі супрацоўнікі ДАІ выявілі, што мужчына быў п'яны, пасадзілі парушальніка на задняе пасажырскае сядзенне ў службовы аўтамабіль і прапанавалі яму паехаць на агляд. Пасля гэтага мужчына раптам дастаў з кірзавага бота раскладны нож і накінуўся на супрацоўніка ДПС, які сядзеў за рулём аўтамабіля, зрабіўшы яму парэзы твару. Другі інспектар, спрабуючы забраць у парушальніка нож, таксама атрымаў некалькі раненняў рук.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
25—27 СТУДЗЕНЯ 2011 г.

НЕ МОГУ МОЛЧАТЬ!

Равнение на Адольфа?

Дорогие мои, милые люди!

Я обращаюсь к тем, кто вышел на Площадь 19 декабря по доброй воле, по совести, по зову сердца и к тем, кого данные события не оставили равнодушными.

Желаю мудрости, крепкого здоровья, силы духа и свободы!

К сожалению, на Площади были и те, кто по принуждению или преступному приказу устраивал провокации, зверски (другого слова я не нахожу) избивал дубинками и ногами беззащитных молоденьких девчонок, парней, старух, молотя с таким остервенением. Эти кадры должны посмотреть все.

Я прошу вас: не отворачивайтесь, не закрывайте глаза! Может, увидите знакомое лицо и, может, вспомните, как кричали в детстве во время драки: "Лежачего не бьют! Двое на одного — не честно!" Кто воспитывал этих людей?

Кстати, о чести. У нас есть "Кодекс чести офицера внутренних войск МВД РБ". "Пункт 1. Служение своей стране и своему народу является высшей целью и смыслом жизни офицера. Пункт 6. Всегда, в любых условиях и ситуациях вести себя сдержанно, тактично и вежливо, соблюдать установленные правила общественного поведения и межличностного общения. Пункт 7. Совершение поступков, несовместимых с понятием офицерской чести, недопустимо с дальнейшим прохождением военной службы и влечет за собой добровольный уход офицера из войск или его увольнение". И кого наказали за отсутствие сдержанности и вежливости 19 декабря? Для кого этот Кодекс чести?

Более того, возьмем журнал "Спецназ" №4 (2006 год, стр.4—6). Статья генерал-лейтенанта Ю.Л.Сивакова, того самого, который подозревается демократической общественностью в причастности к исчезновению известных политических деятелей, так и называется — "О чести". Привожу выдержку из статьи:

"Небезынтересным, я думаю, для многих будет кодекс чести офицера, написанный Адольфом Гитлером... Над многими постулатами, им декларируемыми, есть смысл задуматься. Приведу лишь некоторые выдержки оттуда: "Любовь к фюреру, народу и отечеству превыше всего. Поэтому офицер обязан четко отделить себя от тех, кто стоит в стороне от германского пути и борьбы. Его близкие должны придерживаться тех же убеждений, что и он. Если, к примеру, супруга офицера позволяет себе высказывания, которые могут повлечь за собой уголовное наказание за "подстрекательство", то это никак не делает ему чести".

Вам не страшно? Ну а мне как-то не по себе. И, что удивительно, мы ведь уже слышали нечто подобное из других уст...

Позвольте теперь обратиться к недавней истории, то есть к выборам Президента Республики Беларусь 1994 года, и к самой букве "Закона РБ о выборах Президента РБ", благодаря которому "нераскрученный" человек мог стать президентом.

Статья 27 "Гарантии деятельности кандидатов в Президенты РБ и их доверенных лиц" тогда фиксировала: *"Кандидат в Президенты **не может** быть привлечен к уголовной ответственности, подвергнут аресту, задержанию или мерам административного взыскания, налагаемым в судебном порядке, без согласия Центральной комиссии по выборам Президента РБ".*

Выходит, в то время, то есть 16 лет назад, кандидат в Президенты РБ и его доверенные лица имели **статус неприкосновенности**! Кандидат Лукашенко мог делать что хотел. А теперь?

Смотрим нынешний Избирательный кодекс 2000 года и аналогичную главу "О гарантиях", статьи 73—77. Оказывается, нет уже гарантий неприкосновенности кандидатов и их доверенных лиц. Может, именно поэтому президентские выборы у нас всегда заканчиваются арестами и посадками. Далеко мы продвинулись в демократии.

Во имя безграничной "царской" власти одного человека, во имя "восхитительного", как в гитлеровской Германии, "порядка".

И еще одно. Не могу отказать себе в удовольствии ответить одной "мадам", предложившей женщинам не по площадям ходить, а "варить борщи". Вам ничего не напоминает этот совет? А ведь это тоже один из постулатов гитлеровской Германии: Kuche, Kinder, Kirche. Только взращенный у нас в виде "борща". Назывался этот документ "Национал-социалистический идеал немецкой женщины", а у нас проще - "знай свое место, баба"!

Что же они у нас так все равняются на Адольфа?

Татьяна КОЛЫШЕВА, пенсионерка.
Минск.

БЛІЦ-АПЫТАННЕ

Ці патрэбны вулічныя акцыі?

Партыя БНФ не збіраецца адмаўляцца ад арганізацыі вулічных акцый. "Яны робяць пратэст бачным", — сказаў у прамым эфіры "Еўрапейскага радыё" на Беларусі" старшыня партыі Аляксей Янукевіч. Па яго словах, бліжэйшыя акцыі плануюцца на вясну. Мы вырашылі пацікавіцца ў нашых рэспандэнтаў, звярнуўшыся да іх з такім пытаннем: У СВЕЦЕ АПОШНІХ ПАДЗЕЙ ЦІ ПАТРЭБНЫ ВУЛІЧНЫЯ АКЦЫІ?

Гары ПАГАНЯЙЛА, юрыст:

— Безумоўна, яны могуць быць, каб грамадзяне маглі выказаць сваю грамадзянскую пазіцыю, свой пратэст па тым ці іншым пытанні. І самі па сабе вулічныя акцыі носяць мірны характар. Іншая справа, што ў нас улада падчас гэтых мерапрыемстваў можа неадэкватна прымяняць сілу, а гэта правакуе на зваротныя дзеянні з боку тых, хто пратэстуе. Вось і атрымліваецца супрацьстаянне.

Андрэй КЛІМАЎ, экс-дэпутат Вярхоўнага Савета Беларусі, былы палітзняволены:

— У 2005 годзе, калі я заклікаў людзей выйсці на вуліцу і выказаць пратэст у сувязі з тым, што кіраўнік краіны вырашыў ісці на чарговы прэзідэнцкі тэрмін, Партыя БНФ была адной з тых, хто паспрабаваў сарваць вулічнае мерапрыемства, і пасадзейнічала таму, каб мяне пасадзілі ў турму. Таму, калі гэта і абмяркоўваць з некім, то толькі не з Партыяй БНФ. Лепш ужо з Адміністрацыяй прэзідэнта...

Юрый ШАЎЦОЎ, палітолаг:

— Гэта абсалютна лагічная заява апазіцыйнай арганізацыі, калі ўлічваць, што зараз распачалася канфрантацыя з Захадам. У такі час апазіцыя заўсёды пераходзіць да вулічных акцый. Яны хочуць сесці верхам на тую пратэстную хвалю, якую ўбачылі 19 снежня. Упершыню за апошнія гады на вуліцу выйшла так шмат народу. Няхай многія з іх былі проста цікаўнымі інтэлігентамі альбо студэнтамі, але тым не менш. Іншая справа, што ніхто не скажа, ці пойдуць людзі пратэставаць зараз на нейкія ідэалагізаваныя мерапрыемствы. Могуць і не пайсці.

Зінаіда БАНДАРЭНКА, народная артыстка Беларусі:

— Думаю, што патрэбны, але, можа быць, трэба праводзіць больш сціплым фарматам. Неабходна падтрымліваць тых, хто знаходзіцца ў няволі, рабіць усё, каб яны хутчэй выйшлі з-за кратаў.

— Уладзімір АРЛОЎ, пісьменнік:

— Ва ўмовах, калі апазіцыя пазбаўлена магчымасці выкласці свае меркаванні ў дзяржаўных сродках масавай інфармацыі, вулічныя акцыі часам і застаюцца для яе адзінай магчымасцю ў спробе данесці сваю думку да суайчыннікаў.

Юрый ГЛУШАКОЎ, экс-прэтэндэнт у прэзідэнты Беларусі:

— Падзеі 19 снежня былі вельмі непрыемныя і непрымальныя. Але лічу, што беларускае заканадаўства ніхто не адмяніў. Суадносна і правядзенне масавых мерапрыемстваў дазваляецца па ўзгадненні з мясцовымі ўладамі. Юрыдычныя магчымасці для гэтага ёсць. Іншая справа, калі казаць пра мэтазгоднасць такіх акцый. Пра тое, які эфект ад іх. Думаю, гэтае пытанне застаецца адкрытым.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

ОТКРЫТЫМ ТЕКСТОМ

Не лукавьте, академик Рубинов!

В государственной прессе прочитал: председатель Совета Республики академик Анатолий Рубинов, общаясь с журналистами, критически оценил *"претензии западных экспертов к прошедшим выборам. Он обратил внимание на то, что в таких выводах, как правило, содержится ссылка на некие стандарты. Но таких общепринятых норм просто не существует. Конкретной их формулировки нет. Тогда какие могут быть претензии?"*

Как тут не воскликнуть: не лукавьте, академик Рубинов! Если бы Вы были в возрасте члена БРСМ — возможно, в чем-то заблуждались, путались в понятиях. Но Вам уже за семьдесят, и Вы прекрасно понимаете, о чем ведут разговор западные эксперты, когда оценивают президентские выборы, которые только что прошли в Беларуси. Главный вопрос состоит в том, что это на самом деле было — выборы или фарс? Представители цивилизованного мира склоняются к тому, что по-настоящему демократических выборов у нас в очередной раз не было. Стандарт таких выборов один — открытость, честность, соблюдение прав всех участников процесса на всех этапах политической кампании. А у нас? Я могу, господин Рубинов, привести массу фактов, подтверждающих нарушение законодательства, скажем, при формировании избирательных комиссий. Власть узурпировала проведение выборов уже на первоначальном этапе. Всех неугодных — в сторонку, в напарники — только лояльных и проверенных. В комиссии включались в основном представители тех партий, которые взращены властью и, образно говоря, заглядывают ей в рот. От оппозиционных структур в избирательные комиссии попали единицы, так, для отвода глаз.

Вы, господин Рубинов, говорите, что на Западе нет общепринятых норм по проведению выборов. Ну как же так! В любой развитой стране давным-давно используются прозрачные урны. Оппозиция предложила нашей власти пойти по этому пути. Отказались. И что наблюдатели на многих участках увидели? Урны, в которые можно было заталкивать несметное количество бюллетеней даже после их опечатывания.

На Западе считается стандартом, когда подсчет голосов ведется публично, на виду как у всех членов избирательных комиссий, так и на виду всех, кто имеет право присутствовать в это время на участке. А у нас? В большинстве случаев происходило самое настоящее издевательство над здравым смыслом, над демократией, над волеизъявлением людей. Никакого коллегиального подсчета голосов, вместо этого — имитация, подтасовка. Поэтому на тех немногих участках, где председатели комиссий организовали честную работу всех их членов, результаты голосования и близко не похожи на те, которые озвучила Ермошина. Вы что, господин Рубинов, думаете, люди не знают, как все делалось в ту ночь? Знают, а потому и вышли на Площадь.

Так что не нужно лукавить, говоря о том, что "какие могут быть претензии" к белорусским выборам. Не напомнить ли Вам известную поговорку: черного кобеля не отмоешь добела.

Григорий ЛИНКЕВИЧ, избиратель.

Где слухи, а где правда?

Я не разбираюсь в "политике" уже много лет и на это даже не претендую. Поэтому статья "За кулисами одного заговора" не вызвала у меня интереса. Я на нее не обратила бы внимания, если бы не нелепейшие подробности в тексте, о которых мне написали мои коллеги-экологи.

В первой статье про заговор есть часть "Выдержки из изъятого "Стратегического плана кампании "Говори правду!", где рассказывается о неких слухах, которые позиционируются как "Возможные доминанты будущей контрпропагандистской кампании". Эти слухи якобы распространяла оппозиция, чтобы дискредитировать власть.

Далеко ходить не надо, в любом словаре написано, что слух — это, в первую очередь, недостоверная, официально не подтвержденная информация. Например, "слух — неподтвержденная информация, источник которой не известен".

Самое смешное, что одним из таких слухов в статье про заговор, подчеркну, эффективных для контрпропагандистской кампании, названа следующая информация: "При строительстве АЭС будет использован китайский реактор, который может быть взрывоопасным".

То есть если следовать логике статьи из "Советской Белоруссии", то является слухом и следующая информация, переданная БЕЛТА: "Президент Беларуси Александр Лукашенко приглашает Китай к сотрудничеству по многим проектам, начиная от производства сельскохозяйственной продукции до строительства АЭС. Об этом глава белорусского государства заявил сегодня на встрече в Минске с заместителем председателя Китайской Народной Республики Си Цзиньпином".

Ну и, соответственно, заявления Петра Витязя, если верить тому, что написано в "Советской Белоруссии", — это тоже слухи, распространяемые, видимо, специально для оппозиции: "Корейцы, китайцы и французы предлагают нам свои услуги по строительству АЭС", — сообщил Витязь. По его словам, АЭС в Белоруссии будет построена в любом случае, однако, так как на данный момент Минск не пришел к конкретному соглашению с российской стороной, то Белоруссии не следует отказываться от изучения других предложений", — передает информационное агентство "Регнум".

Вторая часть "слухов" заслуживает внимания — это про взрывоопасность реактора. Хотя, я бы сказала, есть вероятность любой, в том числе тяжелой аварии, которая существует для любого реактора, не обязательно китайского. Вот это уже факт, а не слух.

Следующая цитата из статьи про заговор — это прямой упрек государственным ведомствам и чиновникам. Эффективными слухами названо вот что: "Атомный реактор на АЭС — на самом деле будущие ракеты, платформа для ядерного шантажа..."

Как известно, любая в мире АЭС находится под прикрытием базы ПВО. И если информация про будущие ракеты — это слухи, то что, АЭС собирались строить без такого прикрытия?

И, следуя логике статьи про заговор, выходит, что на общественных слушаниях в Австрии по белорусской АЭС официальная белорусская делегация тоже распространяла слухи для оппозиции? Вот одна цитата: "Яков Кенигсберг: "В октябре я выступал в Москве на совещании антитеррористического центра СНГ. Было совещание по ядерному терроризму. Да, самолет может атаковать АЭС. Мы думаем об этом, есть соответствующие планы. Под них выделяются финансы. Есть объединенная группировка войск Беларуси и России. Граница надежно прикрыта авиацией, ракетами, комплексами С-300. Мы сможем сбить любую цель!"

Татьяна НОВИКОВА, эколог.

SOS!

В стране произошло страшное...

Слушая или читая Новогоднее обращение А.Лукашенко к белорусскому народу, проницательный человек, безусловно, заметил: в стране произошло страшное — общество раскололось на две части. И хотя, по Александру Григорьевичу, одна из них представляет абсолютное большинство граждан, я лично в этом сомневаюсь. Части, как мне кажется, примерно равные.

К такому выводу я прихожу, когда анализирую итоги выборов. Госпожа Ермошина сообщила, что за А.Лукашенко проголосовало почти 80 процентов от всех пришедших на избирательные участки. Заметьте, 20 процентов сразу отпадают, то есть они не поддержали Александра Григорьевича. А во-вторых, можно ли верить официальной цифре Ермошиной, зная, что на тех участках, где был честный подсчет голосов, Лукашенко не набрал и 50 процентов?

Вот вся эта раскладка и дает основание сделать вывод, что белорусский народ раскололся на две примерно равные части. А это очень и очень опасно. Боюсь, что склеить общество Лукашенко не удастся. И тут свое веское слово должны сказать все, кому дорога Беларусь, кого волнует ее не только день сегодняшний, но и завтрашний. Давайте все вместе предпринимать действенные усилия по сплочению нации, по сплочению белорусского народа. Мы живем на одной земле и должны быть дружны и солидарны.

Иван ПЕТРУКОВИЧ, избиратель.

Леанід Кулакоў:

«Ці будуць пакараныя тыя, хто мяне збіў?»

Мінчанін Леанід Кулакоў быў на плошчы Незалежнасці 19 снежня. Падчас разгону акцыі апазіцыі ён быў збіты. Збіты да непрытомнасці.

Зараз ён спрабуе прыцягнуць да адказнасці тых, хто яго збіў...

"На плошчы Незалежнасці я апынуўся згодна з уласнымі перакананнямі, — распачынае аповед Леанід. — У мяне ёсць сумненні, што галасы выбаршчыкаў у Беларусі лічаць правільна, таму я і пайшоў.

Падчас мітынгу я знаходзіўся недзе ў трэцім шэрагу дэманстрантаў, якія стаялі ля ўвахода ў Дом урада. Калі на плошчы Незалежнасці першы раз з'явіліся байцы спецназа, стала страшна. Бо яны пачалі збіваць тых, хто стаяў зусім блізка ад увахода ў Дом урада. Паміж шарэнгамі мітынгоўцаў і спецназаўцаў была зусім невялікая адлегласць — метраў 5—7. І вось у гэтым невялікім "карыдорчыку" я раптам убачыў хлопца з рассечанай у кроў галавой. Я нахіліўся, каб дапамагчы яму. І ў гэты момант я сам атрымаў моцны ўдар дубінкай па галаве. Людзі, якія ўцягнулі мяне ў натоўп мітынгоўцаў, пазней расказвалі, што я заліўся крывёй і страціў прытомнасць... Да машыны "хуткай дапамогі", якая стаяла бліжэй да Чырвонага касцёла, мяне неслі на руках. Там я прыйшоў у прытомнасць. Пасля аказання першай дапамогі мяне адвезлі ў 2-ю бальніцу Мінска. І, натуральна, урачы "хуткай дапамогі" расказалі, адкуль мяне прывезлі і чаму я атрымаў такую траўму... У бальніцы я пакінуў усе свае каардынаты.

І 30 снежня мяне выклікалі ў РУУС Маскоўскага раёна сталіцы. Выклікалі па тэлефоне. Цікавасць да маёй персоны растлумачылі тым, што быццам бы "трэба паразмаўляць наконт траўмы галавы". Я пайшоў. Перад тым як прыняць у мяне заяву наконт таго, што супрацоўнікі міліцыі, якія дзейнічалі на плошчы, неабгрунтавана прымянілі сілу да мірных грамадзян, мне было зададзена некалькі дзіўных пытанняў. На пытанне, ці належу я да ліку сябраў нейкіх палітычных партый, я адказаў, што з'яўляюся сябрам "партыі спачуваючых". Таксама міліцыянераў цікавіла, адкуль я даведаўся пра мітынг. Я растлумачыў, што пайшоў на плошчу па звычцы, бо выбары ў Беларусі фальсіфікуюцца. На пытанне, з кім я быў на плошчы разам, я адказаў, што быў не адзін, а быў разам са сваім сумленнем...

У рэшце рэшт заяву ў мяне прынялі. Супрацоўнікі міліцыі, якія яе прымалі, намякнулі, што шанцаў на тое, што будуць пакараны тыя, хто мяне збіў да непрытомнасці, няшмат. Яны сказалі: маўляў, вы ж дарослы чалавек, самі ўсё разумееце...

Так, я разумею, што пісаць заявы на супрацоўнікаў міліцыі, якія збіваюць свой жа народ, не мае сэнсу, яны і так застануцца беспакаранымі... І ўсё ж я чакаю хоць нейкага адказу з РУУС Маскоўскага раёна Мінска. Мяне, можа, па наіўнасці, але ўсё ж цікавіць адказ на пытанне, ці будуць пакараныя тыя, хто мяне збіў. Заява была мной напісана 30 снежня мінулага года, адказу пакуль няма..."

На жаль, аповед Леаніда Кулакова не адзіны. Ёсць мноства сведчанняў, што байцы спецназа, якія ўдзельнічалі ў разгоне мітынгу на плошчы Незалежнасці ў Мінску 19 снежня, праяўлялі неапраўданую жорсткасць...

Самы яркі прыклад — гісторыя 21-гадовай Маі Абрамчык, якая была збіта 19 снежня недалёка ад плошчы Незалежнасці. Пры затрыманні дзяўчына не магла ісці самастойна — у "аўтазак" яе неслі на руках. Пазней Маі была зроблена аперацыя на наге. Аднак у выпісцы са шпіталя, якую атрымала Абрамчык, значыцца, што прычынай яе знаходжання ў бальніцы стала "бытавая траўма". А скарга Маі Абрамчык на неапраўдана жорсткія дзеянні супрацоўнікаў міліцыі далучана да крымінальнай справы аб "масавых беспарадках", узбуджанай пасля падзей 19 снежня.

Віталь ГАРБУЗАЎ.

ХЛУСНЯ!

Па лекалах Азаронка

Ну, і я паглядзела па БТ тэлестужку "Плошча. Железом по стеклу", якая, магчыма, напалохала далёкіх ад рэальнасці абываценяў: маўляў, дык вось якія яны, гэтыя апазіцыянеры, — сапраўды адмарозкі, пагромшчыкі, стваральнікі "масавых беспарадкаў".

А я, хоць і абураюся хлуслівай лухтой, але не здзіўляюся: улада ж — тая самая, і прыёмчыкі яе ідэалагічных паслугачоў тыя ж. Небезвядомы ястраб тэлекамеры Азаронак пазайздросціць: такі "хіт" скроілі па ягоных лекалах калегі-паслядоўнікі — ну хоць на прэзідэнцкую прэмію вылучай!

Прынцып такога "шытва" — галоўнае, не што здымаць, а як манціраваць і каментаваць. Гэты прынцып выключае нават намёк на логіку і праўдзівасць. Голас дыктара: "Они шли, сметая и круша все на своем пути", а вось відэарадам падмацаваць такое абвінавачанне проста няма як. Ніводнага (!) эпізода "змятання" не знята ні ў адзіным паказаным кадры (а можна ўявіць, колькі разоў яго паўтаралі б, калі б было што зняць), ні ў сведчаннях удзельнікаў мірнай маніфестацыі па праспекце Незалежнасці.

Вось дэманструецца, што нібыта ў затрыманай машыне Някляева акуратна раскладзены вакол ягонага партрэта некалькі нейкіх балончыкаў і розных прыстасаванняў "для штурму". А дзе доказ, што здымкі зроблены менавіта ў някляеўскай машыне? Вельмі падобна на грубую інсцэніроўку, як і сцэна з пошукавым сабакам у нейкім гаражы.

Ну а калі нашы ўвішныя "вартаўнікі спакою" так паспяхова працуюць, абяззбройваючы яшчэ на Нямізе патэнцыяльных нападнікаў і нават адшукваюць іголку ў стозе сена — падлетка, што збег з дому з тэрмасам на Плошчу, дык чаму тады не ўгледзелі, не паадбіралі і не паказалі "зброю пралетарыяту" — арматуру — па дарозе на плошчу Незалежнасці? Службоўцаў ж у цывільным у натоўпе было шмат. Ці не таму, што, па сведчанні ўдзельнікаў падзей, ніякіх падазроных прылад у мітынгоўцаў ніхто не бачыў?

Адкуль жа яны з'явіліся ў руках тых, хто граміў дзверы і шыбы ў Доме ўрада, ды і самі грамілы — адкуль? Чаму доблесны спецназ, які даставілі на плошчу ў незлічонай колькасці і якім нашпігавалі ўрадавы будынак знутры, як заявіў А.Лукашэнка, "за семь с половиной минут очистил площадь", але не звяртаў ніякай увагі на дзеянні штурмавікоў — па сутнасці, не выконваў свае прамыя абавязкі? Пра гэта — ні слова. Наадварот, складвалася ўражанне, што сілавікі аберагалі нападнікаў у іх намаганнях стварыць патрэбную для БТ карцінку...

Дыктар усяляк ганьбіць пагромшчыкаў, якія цэлых паўгадзіны штурмуюць Дом урада, а процьма спецназаўцаў і не рэагуе на гэта. Тэле- і спецаператары спакойненька ўсё здымаюць, а нейкія дзіўныя пагромшчыкі не перашкаджаюць ім, быццам нават пазіруюць. Ніхто іх і пальцам не кранае. А вось "страшны" апазіцыянер Рымашэўскі памкнуўся ўтаймаваць нападнікаў, дык адразу чамусьці менавіта яму дубінкай рассеклі да крыві галаву...

Хто адкажа на просценькае пытанне да камандуючых разгонам: навошта было выпускаць граміл, спагнаўшы нянавісць на бязвінных людзях, каб цяпер тых самых бандзюг "гераічна" шукаць?

Пытанні, пытанні... "Логіка" тэлевыкрывальнікаў "зла" даходзіць да абсурду. Яны гнеўна абрыньваюцца на дэмкандыдатаў у прэзідэнты, што тыя — якія нягоднікі! — не ідуць на штурм Дома ўрада. Так, насамрэч, *не ідуць.* Пэўна, для стваральнікаў "карцінкі" і іх высокіх заказчыкаў было б лепш, каб *ішлі*?! Тады, напэўна, пахвалілі б?

А вось яшчэ надзвычай красамоўныя і пераканаўчыя кадры: чыесьці рукі мусоляць перад камерай пузатыя пачкі "зялёных". О, як загараюцца вочы даверлівых і зайздросных гледачоў-абываценяў: трэба ж, такія, аказваецца, гро-о-шы ў гэтых апазіцыянераў! Нам бы крыху... А мо лепш крыху паварушыць глуздамі: калі такое багацце перад камерай, то — яно ж зусім не ў тых, на каго яго так настойліва навешваюць? Можа, што з гэтага і перападзе стваральнікам хлуслівага фільма. Чамусьці ў мяне сумневы, што і яны, і іх "калегі", спецыялісты дзяржпрапаганды, — ну, як бы мягчэй сказаць — не зусім бескарыслівыя служкі ўлады, гэткія бяссрэбранікі, самаахвярныя змагары за "высокія і чыстыя ідэі"...

...Адразу пасля выхаду на экраны з гэтага гідкага варыва зрабілі яшчэ і радыёварыянт, паднялі шум наконт "вялізнага грамадскага рэзанансу", нібыта выкліканага ім. Усе ўхвалы, зразумела, у адзін бок і праклёны ў другі (таксама зразумелы). Да прыкладу, галоўны рэдактар дзяржаўнага прапагандысцкага рупара — часопіса "Беларуская думка" Вадзім Гігін ў гарачлівым ражы забыўся на сваю вучонасць і дагаварыўся да таго, што быццам масавыя беспарадкі 19 снежня — справа рук "оголтелых националистов" і... *"русофилов"*. Пачуўшы такое (а радыёпрыёмнік у мяне на кухні), я ледзь не выпусціла з рук каструлю з баршчом... Вядома ж, частка слова "фил" паходзіць з грэчаскай мовы і азначае "любіць" у адрозненне ад супрацьлеглага па сэнсе "роб" — ненавідзець, жахацца.

Як Сяргей Маскевіч успрыняў назначэнне на пасаду міністра адукацыі — таямніца. Пакуль не з'явілася ніводнага інтэрв'ю альбо выступу новага міністра адукацыі ў прэсе, дзе б ён даў адказ на гэтае пытанне і расказваў пра свой погляд на адукацыю ў Беларусі. Днямі, праўда, гутарку з Маскевічам прадставіла "Настаўніцкая газета". Тэмай інтэрв'ю стала прынцыпы Кодэкса аб адукацыі. Але сярод казённых фраз цяжка вызначыць штосьці галоўнае. Хіба толькі фразу Маскевіча адносна працы настаўніка і яго сацыяльнага статусу, павышаць які, на думку новага міністра, трэба неадкладна.

— Будзем спадзявацца, што Маскевіч — не самая горшая кандыдатура з тых, каго маглі прызначыць, — выказвае сваё меркаванне старшыня Таварыства беларускай мовы Алег Трусаў. — Любы чалавек у любых умовах можа шмат чаго зрабіць. Гэта закон гісторыі. Помніце савецкага міністра Луначарскага — колькі ён зрабіў у параўнанні з іншымі! Такіх фактаў з гісторыі можна прывесці безліч. Пры любым рэжыме ад чалавека залежыць вельмі многае. Вазьміце нават фашыста Кубэ. Пры ўсіх яго фашысцкіх звычках ён стварыў беларускамоўную адукацыю, спрыяў развіццю беларушчыны. А як яго заблі, то назаўтра ўсё забаранілі. На маю думку, галоўнае ў гісторыі — гэта асоба, і не важна, які гэта рэжым.

Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
25—27 СТУДЗЕНЯ 2011 г.

ЧУЛІ?

У Пінску надрукавалі «палескі радавод» Андрэя Макарэвіча

Пабачыў свет чарговы нумар часопіса "Гістарычная брама", які цяпер выдаецца на базе Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта ў Пінску. Яго "цвіком" стаў артыкул "Палескі радавод рок-музыкі Андрэя Макарэвіча".

Нагадаем, дзед вядомага расійскага рок-музыканта і тэлевядучага Рыгор Андрэевіч Макарэвіч нарадзіўся ў 1886 годзе ў вёсцы Паўлавічы цяперашняга Бярозаўскага раёна. У час Першай сусветнай вайны сям'я выехала ў Расію, у бежанства. Рыгор Макарэвіч жыў у Маскве, у яго нарадзіўся сын Вадзім (бацька Андрэя Макарэвіча), які стаў вядомым архітэктарам.

Беларусь аднеслі да краін, якія рэзка старэюць

Сусветны банк уключыў Беларусь у спіс краін з нізкім узроўнем прыбыткаў насельніцтва, якое рэзка старэе.

У спецыяльным дакладзе Сусветнага банка даецца таксама прагноз у працэнтнай колькасці людзей у свеце да 2050 года. Самай старэючай нацыяй да гэтага часу стане Балгарыя, дзе людзі сталага ведку ў складзе насельніцтва складуць 31,8%. Беларусь у гэтым спісе трапіла на 6-ю пазіцыю з паказчыкам 26,5%.

ЗДАРЭННЕ

П'яны кіроўца збіў пяць чалавек на прыпынку ў Мінску

П'яны кіроўца збіў пяць чалавек на прыпынку грамадскага транспарту ў Мінску. Здарэнне адбылося ўвечары непадалёк ад станцыі метро "Усход". Уладальнік аўтамабіля "Ровер 416" не справіўся з кіраваннем і выехаў за межы праезнай часткі на прыпынак.

Як паказала экспертыза, у яго крыві было 2,60 праміле алкаголю. Пешаходы, якіх ён збіў, атрымалі цялесныя пашкоджанні рознай ступені цяжкасці. Усіх даставілі ў шпіталь, але чацвярых адпусцілі на амбулаторнае лячэнне, паведамляе БелаПАН.

ЛИКБЕЗ

Экран, который не заслонить «начальнику лагеря»

Поставь спутниковую систему за 85 у.е. — и будешь знать, что происходит в Беларуси

Население Беларуси массово не доверяет государственному телевидению. Это факт, и ему есть основание. Вот один только пример.

Вспомним 11 мая 2010 года, когда при тушении пожара на складе завода вычислительной техники в Минске погибли четверо спасателей. При первом известии об этой трагедии все нормальные люди откликнулись мысленно и вслух: "Слава и вечная память героям-пожарным!"

Если бы подобная трагедия произошла в Москве, Варшаве, Париже или Лондоне, то официальный информационный телеканал начал бы итоговый вечерний выпуск новостей с показа портретов героев, с описания их подвига.

А что было показано в тот вечер по Белорусскому телевидению?.. Да все то же: умилительно-восхвалительные сюжеты, как расцветает Беларусь под мудрым руководством ныне действующего президента.

Наша Родина прекрасна,
И цветет, как маков цвет.
Акромя явлений счастья,
Никаких явлений нет!

И только после тошнотворных восхвалений лукашенковского "истеблишмента" был наконец упомянут подвиг минских спасателей.

Судите сами, люди в погонах, как ценят ваши жизни, когда кладете вы их на алтарь Отечества. И что уж тут говорить о простых работягах с предприятия "Пинскдрев"! Их массовая гибель и страдания выживших после взрыва 25 октября тщательно "задвигались" государственным телевидением.

Не доверяя государственным телеканалам, белорусские граждане вынужденно обращаются к спутниковому телевидению. Вообще, это позор для органов государственного управления и информирования — жилые дома, облепленые "тарелками". Означает это то, что налогоплательщики за свои деньги не получают желаемой информации из бюджетных источников. Появление спутниковых антенн на простых хатах в белорусских селах — это приговор для Национальной государственной телерадиокомпании Республики Беларусь. Люди не верят лукашенковским "соловьям".

В цивилизованных странах спутниковая антенна на жилом доме не является признаком материального благополучия его обитателей. Скорее, наоборот. В Западной и Центральной Европе спутниковые телеканалы смотрят в основном бедные иммигранты из азиатских и африканских стран. А вот коренному жителю Варшавы, Парижа или Лондона незачем искать с помощью антенны для дальнего приема некие каналы с экзотическими языками вещания. Ему хватает "родных" каналов в кабельных сетях и местном эфире.

У нас ситуация прямо противоположная. Чтобы узнать о событиях в Беларуси, надо смотреть "чужие" каналы. Чтобы узнать, куда съездил премьер, о чем конкретно договорился (или не договорился) вице-премьер, наш зритель должен обращаться к спутниковым версиям российских телеканалов, которые не допущены к эфирной ретрансляции в стране. На Белорусском же телевидении все заслоняет фигура Единственного и Солнцеподобного. Ему приписывают все успехи и достижения. К слову, есть основания полагать, что в правительстве нашем, в белорусском директорском корпусе работают в большинстве порядочные и компетентные люди. Но об их полезной деятельности БТ практически ничего не рассказывает. Этих людей показывают на экране преимущественно тогда, когда устраиваются публичные разносы — с "тыканьем", с угрозами и оскорблениями со стороны главы государства.

Реальность такова, что с советских времен белорусский телезритель основательно "подсел" на российские телеканалы. Без "Поля чудес", без Пугачевой с Галкиным и бесконечного сериала "про ментов-бандитов-олигархов" многим прожить трудно. Да и на мир в целом мы смотрим через, скажем так, "очко" Москвы.

Но даже эти телеканалы "союзного государства" белорусам не позволяют смотреть в полном объеме. Острые актуальные передачи, которые касаются Беларуси, вырезают у нас здесь, в Минске, а вместо них вставляют старые записи развлекательных шоу.

Раскаиваюсь в бестактной шутке, которую однажды допустил по отношению к соседу по даче, отставному подполковнику. Дело было так.

Подполковник зашел ко мне вечером на огонек и увидел на экране телевизора политическую передачу своего любимого российского телеканала. Обсуждались непростые вопросы белорусско-российских отношений.

Сосед, будучи страстным толкователем проблем внутренней и внешней политики, впился глазами в экран:

— Говоришь, что передача только началась?.. Тогда побегу смотреть на своем телевизоре!

— Ну, беги...

Подполковник исчез в направлении собственной дачи.

Вернулся он минут через десять крепко раздосадованный.

— Почему в моем телевизоре этот же российский канал сейчас показывает какой-то концерт? Как так?..

— Как? А помнишь советскую комедию шестидесятых годов "Добро пожаловать, или Посторонним вход воспрещен", где начальника пионерского лагеря товарища Дынина играет Евгений Евстигнеев? По сюжету комедии детям в лагере показывают французский фильм "Фанфан-тюльпан", который в советском прокате имел ограничение "до 16 лет". Поэтому в будке киномеханика специально сидит работник лагеря и все "сомнительные" сцены с поцелуями периодически закрывает от детей картонкой. Вот и у нас в Беларуси ситуация, как в том лагере: мудрый дядя самолично решает за всех, что можно смотреть простым людям, а что нет... Ты с применением обычной антенны смотришь "адаптированную" версию российского телеканала с приставкой "-Беларусь" в названии. А я через спутник вижу этот же канал в оригинале — не изуродованный цензорами...

Увы, многолетний опыт учит: как только в мире происходит что-либо важное, что касается Беларуси, но не нравится лукашенковским идеологам, то Белорусский радиотелевизионный передающий центр устраивает "день профилактики". На телеэкранах вместо выпусков новостей российских телеканалов мы видим настроечную таблицу.

А ведь, кроме России, мы граничим с Украиной, Польшей, Литвой и Латвией. Мы расположены в центре Европы, и нормальному человеку хочется иметь представление о разных точках зрения на события в его стране и окружающем мире. К слову, жизнь учила не раз, что в ключевых драматических ситуациях (вспомним Чернобыль, особенно первые сутки после катастрофы) нельзя полагаться на монопольную информацию из Москвы.

Поэтому, кроме белорусских программ, я регулярно смотрю украинские "5-й канал", "Перший Національний канал" и канал "Киев", смотрю польские спутниковые "TVP Polonia", "TVN Warszawa", "TVP Kultura". Регулярно включаю русскоязычный канал "ТВ-5" из Риги. Уважительно отношусь к программам интеллигентного петербургского "Пятого канала". Ну и, конечно, смотрю "Белсат", слушаю через спутник белорусскую "Свабоду".

Насколько это технически сложно? Обременительно ли в финансовом плане? Отвечаю со знанием дела.

Ушли в прошлое те времена, когда спутниковые системы были громоздкими, стоили сотни или даже тысячи долларов, а устанавливали их кандидаты технических наук. Теперь же достаточно тарелки диаметром 85 см и тюнера (приемника) размером с книгу, который подключается к любому телевизору.

Рынок насыщен бюджетными комплектами оборудования (обычно на 3 спутника) ценой 85—100 у.е. (можно встретить комплект и за 68 у.е.), в которые включено все до мелочи. Пройдитесь по вещевому рынку, загляните на страницу объявлений местной газеты. Попросите внука набрать в интернет-поисковике слова "комплект на 3 спутника для приема открытых каналов" с привязкой к Беларуси. Вы получите немало адресов местных установщиков спутниковых систем. Работают эти ребята быстро и, как правило, не халтурят с доставкой оборудования и установкой, ибо на рынке установщиков сейчас тесно.

(В скобках выскажусь о дорогостоящих системах для спутникового телевидения высокой четкости с абонентской платой. Честно сказать, они главным образом подходят для того, чтобы хвастаться перед гостями, а в остальном проку от них пока немного. Для меня лично такая система была полезной во время чемпионата мира по футболу минувшим летом. Да, это была суперкартинка на плазменном экране 42 дюйма... Но вообще интересных программ в формате HD пока ничтожно мало, а тратить время и деньги на просмотр американских фильмов про полицейских и роботов-монстров я не хочу.)

Степень сложности самостоятельного монтажа спутниковой системы можно обрисовать так: мужчина-хозяин, который сам подключил стиральную машину-автомат, также сумеет с инструкцией в руках подключить и настроить спутниковый тюнер.

Сколько за это придется платить в будущем? Какова абонентская плата? Отвечаю: нисколько. Здесь идет речь только об открытых каналах. Их такое множество, что вполне хватает для информационного насыщения и просмотра сериалов.

Реалии нашей страны таковы, что в ключевой момент истории лукашенковские прислужники могут отключить интернет, могут конфисковать тираж независимой газеты. А вот дотянуться до спутникового информационного канала у них не получится. Руки коротки.

Желаем успехов в преодолении информационной изоляции.

Николай БЕНЬКО,
посетитель
интернет-сайтов
satavto.by, hdsat.by,
sattelecom.by

Система на 3 спутника ценой 85—100 у.е. сегодня доступна всем.

Некоторые популярные бесплатные спутниковые каналы на русском, белорусском, украинском, польском языках

Спутник Hot Bird 6/8/9 — 13°E

НАЗВАНИЕ	ЧАСТОТА
1-й (Останкино), европейская версия	12597 V
"РТР — Планета"	11034 V
"Россия 24" (Вести)	11034 V
"Радыё Свабода"	12226 V
"Еўрапейскае радыё для Беларусі"	11013 H
R1 (рус. из Германии)	11117 V
K+ (новости Центральной Азии)	11623 V
"Сарафан"	11034 V
EuroNews	12597 V
"Улыбка ребенка"	11566 H
"Шансон"	11034 V
"Союз"	10815 H
"ТВ Армения" (рус.)	12322 H
TVP Polonia, TVP Kultura	11488 H
TVN Warszawa	11508 V
TV Biznes	11158 V

Спутник Astra 4A — 4.8°E

"Белсат" (белорусский независимый канал) и "ТВ Центр" (Москва)	12380 H
"НТВ Мир" (по которому "кино про Батьку") и "ТВ-5" (рус. из Риги)	11900 V
"Новый", "Глас", "КРТ", "Рада", "5 канал"	11766 H
"РТР Планета Балтия", "Первый Балтийский"	11843 H
"ОК" (рус. из Одессы), "Международный славянский канал", "Первый автомобильный", "УНТ"	12073 H

Спутник Amos 2/3 — 4.0°W

"Киев", "Униан-ТВ", "Сити", "1+1", "2+2"	10722 H
"Новый канал", "Первый деловой", "М1", "М2 Эстрада", "Новости-24"	10759 H
"РТР — Планета", "Гамма", "Интер", "Интер+", "Энтер фильм", "Мега"	11389 H

И так далее... А всего, что доступно для языкового понимания обычным телезрителям, невозможно упомянуть.

Вдобавок на этих спутниках вы увидите несколько сот бесплатных каналов из дальнего зарубежья — от высокохудожественного и высоинтеллектуального франко-германского "Arte" до тупо-примитивного "ArabSex". Что кому нравится...

Вот еще полезная ссылка на интерактивную таблицу спутниковых каналов в интернете: www.tv-sputnik.com/ch_select.php. Или http://satdx.narod.ru.

ДУХОЎНЫ СКАРБ

Імя ў яго было спеўнае і звонкае — Салавей

Лёс беларускага паэта Алеся Салаўя быў пакручастым і багатым на падзеі. Але ці многа каго з нашых суграмадзян, што перажылі гвалтоўную калектывізацыю, жахі рэпрэсій і вайны, лашчыў лёс?

Ён узяў сабе звонкае, спеўнае паэтычная імя. А сапраўднае прозвішча Алеся Салаўя — Альфрэд Радзюк. Нарадзіўся ён 1 мая 1922 года ў вёсцы Крысава. Яго дзед Раман быў парабкам у графа Чапскага. Бацька Васіль у багатых гаспадароў пасвіў кароў, гадаваў свіней.

Бацька, дзякуючы настойлівасці і ўпартай волі, з цягам часу выбіўся ў людзі. Скончыў завочна сельскагаспадарчы інстытут і ў Вялікіх Навасёлках кіраваў сельгаспрадпрыемствам. Потым сям'я пераехала ў г.Дзяржынск, дзе Васіль Радзюк да 1937 года быў загадчыкам гандлёвага аддзела райспажыўсаюза. Маці Марыя Сяргееўна была высокаадукаванай, інтэлігентнай жанчынай, якая шмат увагі надавала выхаванню чацвярых дзяцей.

Першыя вершы Альфрэд (сябры і бацькі звалі яго Фрэдзя) напісаў у восем год, а першымі "крытыкамі" былі бацькі. Вучыўся хлопчык у Дзяржынскай сярэдняй школе разам з будучым гісторыкам-першапраходцам, ураджэнцам в.Малыя Навасёлкі Міколам Ермаловічам.

Школьныя сябры згадваюць, як па дарозе на заняткі ўзнёсла настроены юнак часам прасіў сваіх спадарожнікаў запыніцца і, прыхіліўшыся спінай да бярозы, чытаў зачараваным слухачам свае вершы. Ён прысвячаў іх роднаму краю, яго дзівоснай прыродзе. А неўзабаве тыя вершы ("На сенажаці", "Шылава гара", "Ты") пачалі з'яўляцца на старонках раённай газеты і часопіса "Піянер Беларусі". Малады паэт поўніўся радасным,

акрыленым пачуццём, верыў у будучыню...

Ды жнівеньскай ноччу 1937-га на вачах у дзяцей арыштавалі абодвух бацькоў — іх яны ніколі ўжо не пабачаць. Ну як жа, "ворагі народа"! Не вытрымаўшы раптоўнай бяды, дзед Раман наклаў на сябе рукі. На плечы 15-гадовага Альфрэда ўзваліўся недзіцячы цяжар — клопат пра малодшых сястру Алу, брата Лявонку і 4-гадовага Уладзіка. Замест вучобы — знясільваючая катарга на торфараспрацоўцы, разгрузцы вагонаў на ст.Койданава, вывазцы лесу.

У кнізе "Памяць. Дзяржынскі раён" ёсць звесткі, што бацька паэта Васіль Раманавіч Радзюк быў расстраляны ў Мінску ў студзені 1938 года. Рэабілітаваны ў 1960 годзе. Маці, Марыя Сяргееўна Радзюк, асуджаная на 10 гадоў зняволення, адбыла поўны тэрмін незаслужанага пакарання і рана сышла з жыцця. Рэабілітавана ў студзені 1956 года.

...Знаны паэт Мікола Аўрамчык ўспамінае час, калі займаўся разам з Альфрэдам на літаратурных курсах. Ужо тады юнак скардзіўся на слабое сэрца, яму цяжка было падымацца на трэці паверх. І потым, паступіўшы ў Мінскае педагагічнае вучылішча, з-за цяжкіх жыццёвых умоў не змог скончыць яго. Але пяро не выпускаў з рук і шмат чытаў. Захапляўся творамі Янкі Купалы, Максіма Багдановіча, сам пачаў асвойваць такія складаныя класічныя формы верша, як актава, санет, трыялет.

Напярэдадні вайны яго братоў і сястру ўзялі на выхаванне родзічы. Малы Уладзік трагічна загінуў ад выбуху гранаты ў 1941 годзе. А Альфрэд падчас ваеннага ліхалецця, каб выжыць і ўратаваць рэшткі сям'і, працаваў дзе толькі мог. Спрабаваў далучыцца да партызанаў, але кепскі зрок і хворае сэрца перашкодзілі таму.

Жывучы ва ўмовах акупацыі нямецка-фашысцкімі захопнікамі Беларусі, Алесь Салавей не супрацоўнічаў з ворагамі, не пісаў ім оды, ухваляючы "новы парадак". Наадварот, за некаторыя вершы, скіраваныя супраць Гітлера, яго маглі расстраляць ці спаліць у крэматорыі. Вершы і паэмы той пары прасякнуты любоўю да Радзімы, гордасцю за багатае гістарычнае мінулае Беларусі, яе выдатных сыноў Францішка Скарыну, Кастуся Каліноўскага... "За цябе маё сэрца балела,// дарагая мая Беларусь" — гэта радок з яго тагачаснага верша. Неўзабаве ён пачаў ставіць пад напісаным імя-псеўданім "Алесь Салавей".

У 1944 годзе, калі пачалося вызваленне Беларусі ад акупантаў, Салавей апынуўся на чужыне. Не, ён не здрадзіў Радзіме, ні ў чым не запляміў сябе, але прадчуваў, што савецкая ўлада не пашкадуе сына расстралянага бацькі. Апынуўшыся на кароткі час у Берліне, ён напісаў верш, у якім закляміў гітлераўскіх злачынцаў ("Карае вас, карае Божы меч, ліхіх, бясчынных"). Наведаўшы Прагу, сустрэўся з выдатнай беларускай паэткай Ларысай Геніюш. Затым доўгі час жыў у Аўстрыі (г.Зальцбург) у адным з лагераў для выгнанцаў, дзе ажаніўся з Зінаідай Кадняк і стаў бацькам сына Міхася і дачкі Ганны.

Зальцбургскі перыяд для Алеся Салаўя аказаўся плённым у творчым плане. Тут ён напісаў паэмы "Звіняць званы Святой Сафіі", "Сын", тут убачыў свет яго зборнік "Сіла гневу", дзе шмат вершаў прысвечана Беларусі. А ў 1949 годзе Алесь Салавей выехаў з сям'ёй у Аўстралію. Удалечыні ад дому ён сумуе па страчанай Радзіме, вершы яго ў большасці настальгічныя.

У Аўстраліі ў яго нарадзіўся яшчэ адзін сынок — Юрка. Бацька быў на крылах радасці. Але 22 студзеня 1978 года здарылася няшчасце: купаючыся ў акіяне, наш выдатны зямляк памёр ад разрыву сэрца: яно не вытрымала разлукі з Бацькаўшчынай. Пахаваны Алесь Салавей у Мельбурне, на Беларускіх могілках.

На вялікі жаль, яго кнігі, як і кнігі іншых выдатных беларускіх паэтаў, што апынуліся ў замежжы, Масея Сяднёва, Рыгора Крушыны, а таксама выдатнай дачкі беларускага народа Ларысы Геніюш, на іх радзіме, у сённяшняй Беларусі, не друкуюцца дзяржаўнымі выдавецтвамі...

Да нядаўняга часу пра паэта Алеся Салаўя, яго жыццёвы шлях можна было даведацца толькі з цікавага эсэ "Жыву і дыхаю, мой край, табой..." пісьменніцы, прафесара Лідзіі Савік у яе кнізе "Пакліканыя". Сёлета незалежным выдавецтвам "Лімарыус" выдадзена кніга "Алесь Салавей". На яе 560 старонках упершыню на Беларусі друкуюцца яго шматлікія вершы, паэмы, проза, драматургія, вершы для дзяцей. Знайшлі сабе месца і лісты паэта, успаміны аб ім суайчыннікаў. Кніга аздоблена шматлікімі фотаздымкамі.

Лявон ЦЕЛЕШ.



г.Дзяржынск.

Алесь САЛАВЕЙ

Не пакіну

Цяжка тут без цябе на чужыне,
о, Матуля, старонка мая!
Як дзіця, я цябе не пакіну,
на цябе не забудуся я.

Панясуся птушыным узлётам
на кілімы зямлі дарагой.
Не, нідзе няма лепшых пяшчотаў
за тваю пад радзімай страхой!

1942

Эпіграмы

Сягаць не раю аж пад неба,
калі йшчэ трошкі не дарос —
не сунься з носам, дзе не трэба,
бо гэтак хутка страціш нос.

***

Быў гэткі ён: усіх дурнымі
лічыў, сябе ж за зуха меў,
хацеў быць мудрым над усімі,

ПАДЛІЧЫЛІ...

Амаль 1700 мінчукоў летась захацелі памяняць імя ці прозвішча

Галоўнае ўпраўленне юстыцыі Мінгарвыканкама ў 2010 годзе разгледзела 1696 матэрыялаў ад жыхароў сталіцы па пытаннях змены імя, прозвішча ці імя па бацьку.

Мяняць свае пашпартныя даныя дазваляюць грамадзянам Беларусі, якім мінула 16 год. Для такога рашэння павінны быць вельмі важкія прычыны. Напрыклад, складанае для вымаўлення ці немілагучнае імя ці прозвішча. Часам людзі хочуць змяніць пашпартнае імя на тое, якое ім далі пры хрышчэнні. Некаторыя лічаць, што змена імя нейкім шчаслівым чынам паўплывае на іх лёс.

Пры гэтым трэба мець на ўвазе, што мяняць імя ці прозвішча забаронена асобам, якія прыцягваліся да крымінальнай адказнасці. Таксама адмаўляюць тым, хто мае нявыплачаныя штрафы ды іншыя праблемы з праваахоўнымі органамі, паведамляе БЕЛТА.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
25—27 СТУДЗЕНЯ 2011 г.

МАЗАІКА

Дык пройдзе ў Беларусі чэмпіянат свету па хакеі ці не?

Намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Анатоль Тозік правёў рабочую нараду, прысвечаную ходу падрыхтоўкі да правядзення чэмпіянату свету па хакеі з шайбай 2014 года ў Мінску, паведаміла прэс-служба ўрада.

Тозік даручыў Мінспорту сумесна з зацікаўленымі ведамствамі ўнесці змены ў склад аргкамітэта па падрыхтоўцы і правядзенні чэмпіянату свету і зацвердзіць план яго працы на 2011 год. Мінгарвыканкаму даручана забяспечыць выкананне графіка работ па будаўніцтве лядовай арэны ў мікрараёне "Чыжоўка", завяршыць узвядзенне комплексу "Студэнцкая вёска" ў Мінску, пачаць рэалізацыю праекта інтэлектуальнай транспартнай сістэмы сталіцы, а таксама будаўніцтва гасцінічных комплексаў катэгорый ад трох да пяці зорак.

Правядзенне чэмпіянату свету па хакеі запланавана на 9—25 мая 2014 года.

Між тым, як паведамляе БелаПАН, Еўрапарламент лічыць немагчымым правядзенне ў Беларусі чэмпіянату свету па хакеі-2014 і іншых спартыўных мерапрыемстваў міжнароднага ўзроўню, пакуль у краіне застаюцца палітзняволеныя.

Прэтэндуюць 130 чалавек

Па дынаміцы спартыўных вынікаў на 1—8-е месцы на XXX Алімпійскіх гульнях 2012 года ў Лондане прэтэндуюць 130 чалавек, паведаміла прэс-служба Міністэрства спорту і турызму па выніках сумеснага пасяджэння калегіі Мінспорту і выканкама Нацыянальнага алімпійскага камітэта на тэму падрыхтоўкі да Алімпіяды.

Па выніках 2010 года беларускія спартсмены заваявалі першыя дзве ліцэнзіі на лонданскую Алімпіяду (Сяргей Мартынаў і Вікторыя Чайка ў кулявой стральбе).

На 20 студзеня асноўны спіс кандыдатаў на ўдзел у Гульнях складае 275 спартсменаў у 31 відзе. Нацыянальныя каманды ажыццяўляюць падрыхтоўку для заваявання права выступіць не менш як у 115 з 302 дысцыплін праграмы Алімпійскіх гульняў (на пекінскай Алімпіядзе 2008 года беларускія спартсмены ўзялі ўдзел у 112 дысцыплінах 26 відаў спорту). Плануецца ўдзел у лонданскай Алімпіядзе зборных па таэквандо і футболе.

Асноўныя прэтэндэнты на ўдзел у Алімпіядзе-2012 у ключавых для беларускай каманды дысцыплінах вызначацца па выніках 2011 года ў кулявой стральбе, цяжкай атлетыцы, барацьбе вольнай і грэка-рымскай, мастацкай гімнастыцы, веславанні акадэмічным, веславанні на байдарках і каноэ, боксе, паведамляе БелаПАН.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Анатоль КОЛЧЫН:

«Паддаўся спартсмен спакусам — пішы прапала»

*Чэмпіянат краіны па боксе, які ў гэтыя дні праходзіць у Магілёве, можна сказаць, дае афіцыйны старт алімпійскай падрыхтоўцы беларусаў да Гульняў-2012 у Лондане. Карэспандэнт "Народнай Волі" гутарыць з галоўным трэнерам нацыянальнай зборнай Беларусі па боксе **Анатолем КОЛЧЫНЫМ**.*

29 студзеня, калі на рынгу пройдуць фінальныя паядынкі, фактычна будзе сфарміраваны склад каманды, які праз 9 месяцаў на чэмпіянаце свету ў Азербайджане пазмагаецца за ліцэнзіі ў алімпійскі Лондан. Пераможцы краіны з вялікай доляй верагоднасці гарантуюць сабе ўдзел у гэтым турніры.

— Анатоль Кірылавіч, давайце пачнём з банальнага... Якія планы на гэты год?

— Пасля чэмпіянату краіны пачнём рыхтавацца да сусветнага першынства, якое пройдзе ў Баку. Там і будзе ісці размова аб алімпійскіх ліцэнзіях.

— Нашы перспектывы?

— Будзем змагацца за тое, каб патрапіць на Алімпійскія гульні, а як там атрымаецца — жыццё пакажа. Аднак плануем заваяваць чатыры алімпійскія ліцэнзіі.

— Мінулы год можна назваць для зборнай удалым?

— Безумоўна! Упершыню за ўсю гісторыю беларускага бокса было заваявана чатыры медалі на чэмпіянаце Еўропы.

— А хто з баксёраў больш за ўсё парадаваў?

— Ды ўсе ў камандзе папрацавалі добра, хто заваяваў медалі.

— Сваім вучнем, прызёрам Алімпіды Віктарам Зуевым у апошні час задаволены?

— Па вялікім рахунку, так. Ён перайшоў у цяжкую вагавую катэгорыю, стараецца... І "бронза" чэмпіянату свету ды еўрапейскае "серабро" яшчэ раз таму пацвярджэнне. Стабільныя вынікі два гады запар не могуць не радаваць.

— Некаторыя крытычна ставяцца да таго, што ў беларускай камандзе шмат, так бы мовіць, "легіянераў"... Як вы да гэтага ставіцеся?

— Па-першае, ёсць міжнародныя правілы, згодна з якімі мы не маем права запрашаць у зборную проста так, як вы кажаце, "легіянераў". Чалавек павінен пражыць не менш за тры гады ў краіне і мець грамадзянскі пашпарт. Толькі пасля гэтага ён можа выступаць за нацыянальную каманду. І мы ў гэтым выпадку не выключэнне. Але нашы "зборнікі" Вазген Сафар'янц, Магамед Нурудзінаў — яны ўжо даўно жывуць у Беларусі, маюць беларускія пашпарты, і ніякіх пытанняў з гэтай нагоды быць не павінна. Але, безумоўна, трэба развіваць і сваю школу бокса.

— І што чуваць з бліжэйшым рэзервам?

— Таксама ёсць дасягненні ў мінулым годзе. Рэзерв падцягваецца, але пераход у дарослы спорт не заўсёды праходзіць так, як хацелася б.

— Анатоль Кірылавіч, ці можна сказаць, што Вадзім Кірыленка — узыходзячая "зорка" беларускага бокса?

— Да гэтага трэба адносіцца з пэўнай ступенню добрага гумару, бо "зоркі" ў першую чаргу дэманструюць стабільнасць у сваіх выступленнях. А Вадзім пакуль толькі "выстраліў". Не трэба падымаць на нябёсы чалавека раней часу, каб галава не закруцілася ад славы. А то затым не ўсе трымаюць удар па гэтай самай галаве, хоць у боксе гэта і здараецца. Таму я рады, што ёсць такі перспектыўны баксёр, але яму трэба яшчэ працаваць і працаваць.

— Былі выпадкі ў боксе, калі малады, таленавіты спартсмен губляўся ў промнях славы?

— Такія выпадкі ёсць ва ўсіх відах спорту. Ды што там у спорце — у жыцці на кожным кроку. Многія людзі самі па сабе слабыя, і, калі паддаюцца спакусам, — пішы прапала.

— Што яшчэ патрэбна, каб на "зорнасць" не захварэць?

— Час, усюды патрэбны час... І характар, каб пераламіць сябе.

— Сёння зборная рыхтуецца без праблем ці ёсць нейкія пытанні, якія неабходна вырашаць?

— Здаецца, усё ідзе па плану. І Міністэрства спорту, і федэрацыя дапамагаюць, чым могуць. Усё астатняе залежыць ад нас саміх.

Алесь СІВЫ.

ЗАКУЛІСЬЕ

Почувствуйте разницу

Британская газета The Independent составила для голландского тренера Руда Гуллита список отличий лондонского района Челси от Грозного. Гуллит в прошлом тренировал лондонский футбольный клуб "Челси", а 18 января 2011 года занял пост главного тренера грозненского "Терека".

Список отличий Челси от Грозного, составленный The Independent, включает три пункта. Во-первых, издание указывает на запрет на продажу алкоголя в Чечне (купить спиртное в республике можно только с 8 до 10 утра). Отмечается, что в Лондоне Гуллит мог посещать множество баров, а в Чечне ему нальют алкоголь только в некоторых кафе "за небольшую взятку".

Вторым отличием двух городов The Independent называет трудности, с которыми может столкнуться жена Гуллита. Как пишет британская газета, в Грозном женам и подругам футболистов небезопасно прогуливаться по улицам, где орудуют "банды подростков", которые "обстреливают из ружей для пейнтбола женщин, не носящих платков".

Третьим отличием, как пишет издание, является название главной улицы. В Челси, как отмечает The Independent, это Кингс-роуд (King's Road, дословно — "улица короля"), а в Грозном — проспект Путина. Издание подчеркивает, что такое название главной улице дал Рамзан Кадыров в благодарность премьер-министру России за финансирование восстановления Грозного, который, как иронически отмечает автор материала, разбомбили в 2000 году именно по приказу Владимира Путина.

В статье, озаглавленной The worst football transfer in the world? ("Худший футбольный трансфер в мире?"), тренерская карьера Гуллита называется одной из самых удивительных в истории. Автор пишет, что наставник, в прошлом работавший с "Челси", теперь возглавил "команду чеченского военачальника" (имеется в виду Кадыров).

Издание отмечает, что в прошлом у Гуллита нередко возникали разногласия с клубными руководителями — в частности, из "Челси" голландец ушел из-за конфликта с бывшим владельцем команды Кеном Бейтсом. The Independent подчеркивает, что несколько человек, конфликтовавших с Кадыровым (например, братья Ямадаевы), были убиты.

Дорогой Подольски

Немецкий футбольный клуб "Кельн" оценил полузащитника сборной Германии Лукаша Подольски в 15 миллионов евро.

Именно такую сумму придется заплатить питерскому "Зениту", если он решит купить игрока. Об этом сообщает сайт издания "Советский спорт". Официально переговоры о переходе Подольски в российский клуб пока не начались.

Контракт полузащитника с "Кельном" действует до июня 2013 года. Однако перейти в "Зенит" он может уже в начале 2011 года (трансферный период в России продлится до марта).

В 17 матчах чемпионата Германии сезона-2010/11 Подольски забил пять мячей. "Кельн" в 18 играх набрал 16 очков и расположился на 16-м (третьем с конца) месте в турнирной таблице. По итогам сезона бундеслигу покинут клубы, занявшие в первенстве страны три последних места.

За сборную Германии Подольски регулярно выступает с 2004 года. За национальную команду полузащитник провел 81 матч и забил 41 гол.

На кону — порядочность

Матч российского теннисиста Теймураза Габашвили с итальянцем Филиппо Воландри, состоявшийся 25 октября 2010 года на турнире в Санкт-Петербурге, попал под подозрение у букмекеров.

В настоящее время обстоятельства этой игры расследует Ассоциация теннисистов-профессионалов (ATP), пишет итальянское издание Ubi Tennis.

Матч Воландри—Габашвили прошел на турнире в Санкт-Петербурге в рамках первого круга и завершился победой россиянина со счетом 3:6, 6:3, 6:2. Что именно показалось букмекерам подозрительным, не уточняется, но обычно в подобных случаях речь идет о необычно большом объеме ставок на матч.

У Воландри ATP затребовала подробный отчет обо всех телефонных звонках, совершенных игроком, и сведения о банковских счетах теннисиста. Кроме того, ассоциация занялась проверкой связей итальянца с игроками на тотализаторе. Проводится ли аналогичное расследование в отношении Габашвили, не уточняется.

Самый крупный скандал, связанный с подозрительными матчами в теннисе, произошел в 2007 году, когда предметом изучения ATP стали необычно крупные ставки на аргентинца Мартина Вассальо Аргуэльо в игре с россиянином Николаем Давыденко на турнире в польском Сопоте. Матч закончился отказом Давыденко от борьбы из-за травмы. Россиянина и аргентинца подозревали в нечестной игре, но впоследствии эти подозрения были сняты.

Алесь СВЕТЛАНИЧ.

Я ВАМ ПИШУ...

Оппозицию — на развитие физкультуры

Сложившаяся система "перетасовки" правительственных кадров, покрытие государственными программами большинства социально значимых проектов не дадут явного лидера и авторитетного представителя оппозиции. Необходима активная, позитивная, свободная от внимания госчиновников работа среди населения.

Причем деятельность должна вестись в рамках республиканского общественного объединения на протяжении нескольких лет и охватывать все население страны. Предлагаю выбрать направление на развитие массового физкультурного движения. Уверен, что правительство никогда не будет в полной мере заниматься физкультурой. Управлять опущенным с похмелья работником проще и дешевле. У трезвого, физически сильного и выносливого работника появляются такие вопросы, на которые чиновники ответить не могут.

Правительству легче привезти в страну десяток спортивных гастарбайтеров. Они и объявят всему миру о хорошо налаженной профилактической работе, направленной на пропаганду "здорового образа жизни" в стране. К тому же могут возникнуть вопросы пополнения бюджета поступлениями от алкогольной и табачной промышленности, организации трезвого досуга рабочего класса.

Создается мнение, что правительство придерживается идеологической формулы: пьющий народ — это проблема самого народа, трезвый народ — это проблема правительства.

Физкультура подменена так называемой спортивно-массовой работой, а попросту — любительским спортом. Все объекты, которые построены и будут строиться, предназначены для спортсменов, а физкультурникам, на чьи деньги они реально и построены, предложено за их небольшую зарплату посещение на платной основе. Альтернативы — бесплатных физкультурных программ — нет.

Спортивно-массовая работа проводится по спортивным методикам — соревновательно-отчетным. Где главное и единственное — провести мероприятие и отчитаться о затраченных средствах. Многотысячные трудовые коллективы на спартакиадах представлены двумя-тремя десятками спортсменов. Министерство спорта признает, что в спортивных обществах задействовано 50 процентов молодежи. И это по их подсчетам.

Представляете, какая часть населения не задействована в мире физкультуры и спорта? И эти люди ждут ту организацию, которая привлечет их к физкультуре. В которой они почувствуют себя востребованными. От деятельности которой у них и у их близких появится возможность приобщения к "здоровому образу жизни".

Тогда и лидер, возглавивший эту организацию, если не будет сменяем правительством, станет узнаваем и почитаем в глазах населения.

Виктор МАЦКО.

Гродно.

ФУТБОЛ

За паўкроку да перамогі

У мінулыя выхадныя футбалісты салігорскага "Шахцёра" прайгралі ў фінале Кубка Садружнасці бакінскаму "Інтэру".

Крыўдна, што паездка ў Санкт-Пецярбург стала для салігорскай каманды ўсяго толькі "сярэбранай". "Шахцёр" быў у паўкроку ад "золата", і, калі б фартуна падчас прабіцця рашаючых пенальці (асноўны і дадатковы час закончыліся ўнічыю — 0:0) была больш лагоднай да беларускай каманды, так бы яно і здарылася. Безумоўна, турнір — не Ліга чэмпіёнаў. Але ж на тое такія турніры і праводзяцца, каб у іх паказваць характар і перамагаць...

— Пенальці — гэта фартуна, — сказаў пасля гульні галоўны трэнер "Шахцёра" **Уладзімір ЖУРАВЕЛЬ**. — Але па вялікім рахунку каманда згуляла добра, я задаволены ігракамі.

— У Санкт-Пецярбург прыехалі вельмі сур'ёзныя каманды, для якіх гэта быў прыярытэтны турнір, — дадаў форвард салігорскай каманды **Аляксандр Алумона**. — Ведаю, што многія спецыяльна рыхтаваліся да Кубка Садружнасці ў Турцыі, а некаторыя правялі нават па два зборы. У нас жа такой падрыхтоўкі не было. Першапачаткова наогул не планаваўся ўдзел "Шахцёра" ў турніры, усё вырашылася ў апошні момант, а таму нават давялося раней выйсці з адпачынку. Узровень мне спадабаўся, а вось каляндар аказаўся дастаткова складаным. Практычна не было часу на аднаўленне. На фоне стомленасці каманды не паказвалі на полі і палову сваіх магчымасцяў. Найбольш цяжка давялося ў матчы з кіеўлянамі, бо гэты чвэрцьфінал гуляўся на наступны дзень пасля апошняга тура групавога турніру. Кіраўніцтва перад намі асаблівых мэтаў не ставіла, а трэнер сказаў, што калі мы ўжо едзем у Санкт-Пецярбург, то павінны выйграваць па-сапраўднаму. Хоць адказнасць на нас не ціснула. Прэміяльныя планаваліся толькі за выхад у фінал і за перамогу. Але ж, зразумела, што асноўнай матывацыяй з'яўляліся не грошы, а сама перамога ў турніры.

Алесь СІВЫ.

ШАХМАТЫ

Задача-лаўрэат *Л.Кнотек*

Белые: Крh5, Фе1, Сb2, Кс1, Ке2 (5).
Черные: Крс2, п. с4 (2).
Мат в 3 хода.

Предлагаем вниманию читателей трехходовую задачу-миниатюру чешского проблемиста Л.Кнотека, которая была отмечена первым призом на конкурсе. Попробуйте найти ее решение. Свои ответы присылайте по адресу: **220030, Минск, ул.Энгельса, 34а, редакция газеты "Народная Воля", "Шахматы".**

Чемпионке мира — 16 лет!

В Турции прошел чемпионат мира по шахматам среди женщин. Соревнования проводились по так называемой нокаут-системе, участницы проводили между собой матч с выбыванием проигравшей. Чемпионат прошел при большом преимуществе китайских спортсменок. Они и разыграли чемпионский титул в финале, в котором встретились Хоу Юфань и Жуань Луфэй. Борьба в заключительном решающем поединке была очень упорной. Отведенные регламентом 4 партии не дали перевеса ни одной из соперниц — 2:2. На тай-брейке лучшей была Хоу Юфань, победившая со счетом 3:1. Новой чемпионке мира всего 16 (!) лет. Она самая юная чемпионка мира в истории шахмат. До этого рекорд принадлежал Майе Чибурданидзе. В 1978 году она победила пятикратную чемпионку мира Нону Гаприндашвили в возрасте 17 лет!

Финалисты определились

В Минске прошли турниры первой лиги чемпионатов Беларуси по шахматам среди мужчин и женщин. Соревнования проводились по швейцарской системе в 9 туров. У мужчин борьбу за 6 путевок в высшую лигу чемпионата 2011 года вели 78 спортсменов. В острейшей борьбе победу одержал молодой кандидат в мастера Андрей Горовец (Минск), набравший 7 очков. На пол-очка отстали сразу 9 участников. По дополнительным показателям путевки в высшую лигу завоевали кандидат в мастера Виталий Мерибанов, международный мастер, неоднократная чемпионка Беларуси среди женщин Наталья Попова, гроссмейстеры Юрий Тихонов, Игорь Люцко, международный мастер Валерий Смирнов (все из Минска). Такой же результат показали международный мастер Павел Ломако, кандидаты в мастера Денис Трифонов, Сергей Валевич (все из Минска), Антон Сегодник (Брест).

У женщин в турнире выступили 24 шахматистки. В числе 5 финалисток попали Ольга Молотилова (Витебск), Екатерина Богдан (Светлогорск), набравшие по 7 очков, Екатерина Касперович и Татьяна Рево (обе из Минска) — по 6,5, Наталья Кусенкова (Бобруйск) — 6 очков.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск,
вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная:
тэл./факс
(017) 3286871.
Тэл./факс
рэкламнага
аддзела: (017)
3286904, 3286906
E-mail :
nv@promedia.by
http://www.nv-online.info

ISSN 207.-9647
9 772071 964000 11011

Падпісныя індэксы: 63222,632222

Заснавальнік
і галоўны рэдактар
Іосіф Паўлавіч
СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродка масавай інфармацыі №947 ад 6 студзеня 2010 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў друкарні РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Падпісана ў друк 24.01.2011 у 18.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж 24270 экз. Заказ 363.